


ПАГОНЯ

Жыве Беларусь!

Грамадзка-палітычная газэта

Заснавана ў 1920 г.

№ 9 9—22 кастрычніка 1992 г. Кошт 1 рубель

Мітынговыя зацемкі

Румыны, амэрыканцы, беларусы

Нядаўна бачыў, як румыны рыхтуюцца да прэзідэнцкіх выбараў. Глядзіш у тэлевізар, ды ня можаш даць сабе веры: няўжо ж гэта тыя самыя румыны, яшчэ тры гады таму затурканыя й паслухмяныя, перакананыя ў тым, што кожны другі сярод іх — стукач сэкурытатэ?! Тэлекамэры зазіраюць у друкарню, дзе адбіваюцца ўлёткі, плякаты, потым — на выбарчы ўчастак, бачым вулічныя стэнды зь дзесяткамі каляровых партрэтаў кандыдатаў у парлямэнт і прэзідэнцкае крэсла, бачым людзей, якія прагнуць галасаваць, бачым шматтысячныя мітынгі. Запалоханы,



але жывы народ. НАРОД.

Леташні мітынг, які наладзілі ў Горадні дэмакратычныя сілы, адбыўся ў верасьні, такі ж самы сёлетні — 1 кастрычніка. Уражаньні? Неадназначныя. Не, што датычыць арганізатараў, дык яны зрабілі слушны крок й на належным узроўні правялі мерапрыемства. Сум выклікае іншае. Але, мусіць, усё пачаргова.

Усё было падрыхтавана паводле Закону: заява ў гарвыканкам, дазвол на правядзеньне і г. д. Мы прыйшлі на пляц, прабачце, Ільліча крыху раней. Было халодна. Давялося схавацца ўнутр былога гаркама партыі (бальшавікоў). Карацей кажучы, нейкі час мы назіралі з-за кулісаў. Зьлева імпартовая машына з гучнікамі, справа — са сьпіны наш аграмадна гарадзенскі Ільліч, пасярод — хлопцы, якія сьпяваюць пад гітары акампанэмэнт «У гушчарах...» ды іншыя патрыятычныя песьні.

Люду сабралося, як і летась, колькі соцень. Тыя ж самыя знаёмыя твары. Тыя ж самыя словы, якія ведаеш напамяць. Атрымліваецца, што пераконваем самі сябе, ды зьмерзлы міліцэйскі патруль? Да нашае купкі падыйшоў нейкі незнаёмы дзядзька. Ён, мусіць, адчуваў сябе крыху актoрам. Нейк саркастычна ён пачаў нас распытваць, што гэта за помнік й чаго тутка дагэтуль стаіць. Я адчуваў сябе ніякавата, карцела пазяхнуць ці засьмяяцца. Дзядзька, я згодны, ня трэба мяне пераконваць, я ў свой час цэлую нізку аповедаў напісаў пра гэты самы помнік. Твае б словы ды Богу ў вушы...

Памятаю з тэлевізара, як у Бухарэсьце валілі яшчэ большага ад нашага Ільліча. Колькі ў Саветах лямanту было! І хоць у Румыніі кіруюць нэакамуністыя, народ разьняволіўся: над ім болей няма злавеснага ценю завадатара Вялікай крыві... Хлусіць можна доўга, але бязконца — не. Пакуль мы былі пазбаўлены права на вольнае атрыманьне любой інфармацыі, кожнае паведамленьне абвяргаць было проста: маўляў, буржуазная прапаганда. Днямі мы мелі магчымасьць па першай Варшаўскай тэлепраграме пaглядзець першую чарадоўку «Заплёмбаванага вагону» славутага італьянскага кінарэжысёра Д. Даміяні. Імкненьні Леніна супалі з жаданьнем немцаў выключыць Расею з вайны. Астатняе вядома, і ўсё гэта праўда. Карацей кажучы, наш гарадзкі стод — немецкі шпіён, пра што заўжды ведаў увесь разумны сьвет, апроч нас. Мы раней сумняваліся.

Дарэчы, калі леташні мітынг адбыўся ва ўзножжы помніка, дык сёлета мікрафон сьвядома паставілі далей управа. Але ўсё адно, як сьпявае «Мроя»: «А Ільліч усьміхаец- ца!» Клялі яго, праўда, у мікрафон. Але што з таго! Вось каб пайсьці ды подпісы сабраць, каб перакуць гэты кавал бронзы на штосьці карыснае, як калісьці «мечи — на орало». Але адказ гарадзянаў можна прадбачыць... Ці ведаеце, што мне адказаў адзін знаёмец, якога я паклікаў на мітынг? «Бульбу капаць трэба». Ну проста няма за гэтага хітрага беларуса разумнейшых на ўсім сьвеце! Амэрыканцы замест таго, каб сеяць і г. д., ужо пайгода ці болей бавяцца ў прэзідэнкія перадвыбары, можна сказаць, закопваючы ў зямлю соткі мільёнаў «дольцаў». Увагу французаў адцягваюць на галасаваньне аб якімсь Маастрыхцкім пагадненьні. Румыны, і тыя з-за свайго выбарчага лайдацтва памарозяць у баразьне ўсю бульбу. Навошта нам мітынгі!

Мой пэсімізм, зрэшты, болей вонкавы. Няпраўда, што не было карысьці ад акцый БНФ, няпраўда, што марна прамаўляў Пазьняк, няпраўда, што парлямэнцкая апазіцыя ня мае вынікаў. Усё тое, што адрозьнівае сёньня наш Край ад БССР, дасягнута дзякуючы іхнім і нашым высілкам. І народ наш зьмяняецца, хоць і вельмі паволі. Апроч канфармізма, мае ён у сабе і пэўную еталую мудрасьць. Прыкладам, віравала да 39-га ўся заходняя Беларусь. І чым усё скончылася? Ня лепшым за рэдзьку хрэнам. Мудрасьць народа — у стрыманасьці яго пачуцьцяў. Як ніколі, яму сёньня патрэбны лідэры, да якіх бы ён меў у сэрцы давер: беззаганныя, талерантныя, годныя, вартыя павагі.

Мітынгі нашы застаюцца малалюднымі, але вынікі ўсё адно ёсьць. Расьце давер да БНФ. Невыпадкова ж акцыю «Рэфэрэндум» падтрымала 440 тысяч чалавек: беларусаў, палякаў, рускіх. Адназначна выказалася Горадня. Народ ня дурны, а разважлівы, ён пакуль прыглядаецца, бо інстынктыўна асьцерагаецца быць падманутым яшчэ аднойчы. А што датычыць Ільліча, дык можа й сапраўды, халера зь ім, хай яшчэ крыху пастаіць?! Каляровыя мэталы ў цане ня падаюць...

Сабраныя прынялі рэзалюцыі на адрас вышэйшае ўлады наконт Рэфэрэндуму, Беларускага войска і іншыя. У час мітынгу адбываўся запіс у шэрагі «Грунвальду» афіцэраў-рэзэрвістаў. А румыны, як вядома, зноў выбралі Ільіеску.

С. АСТРАВЕЦ.



На здымках: бяз слоў; выступае старшыня Гарадзенскае Рады БНФ сп. К. Жынь.

Фота У. ВЫДЭРКІ.

● РЭФЛЕКСІІ

МУЖЫК, СПАДАР, ТАВАРЫШ

Дзіўныя мы людзі беларусы: сваё, хоць і добрае, але ганім, чужое — благое, наадварот, цягнем на сябе. Прыкладаў ня зьлічыць, але мне хочацца зьасяродзіць увагу на адным: узаемачалавечых зваротах. Ураўняльны зварот «товарищ» паціху адыйшоў як чужынец з нашага ўжываньня. Яму на зьмену прыйшлі лагодныя беларускія: спадар, шаноўны, паважаны, але дагэтуль большасьць грамадства ставяцца да беларускіх тэрмінаў з пагардай або іроніяй.

Сьвежы прыклад. Нядаўна зайшоў у буфэт тытунёвай фабрыкі. У чарзе толькі жанчыны, узаемныя звароты сяброўак па працы: «что ты будзеш жраць», ці «даеш в цеху, не подавішся». Калі я зьвярнуўся да жанчын — чаму вядуць так гамонку, яны засаромеліся (і гэта ўжо добра), а адна зь іх, больш сьмялейшая, адказала, што такім чынам лацьвей выславіцца...

Вось чаму, калі чую сьмех у адносінах да нашых зваротаў «спадар» ці «шаноўны», спрабую тлумачыць, што гэта народны выраз, так грамада выказвала пашану адмысловым гаспадарам, майстрам, і ўволуле паважаным людзям, а пайшоў зварот «спадар» ад вядомага «гаспадар».

Шкада толькі, што народ сувэрэннай дзяржавы дагэтуль не разумее жыцьцёвай неабходнасьці, што беларуская мова і культура ачысьціць душы нашай нацыі ад бруду, які нанесла да нас інтэрнацыянальная мова камуністаў. Бо наша чыстае слова не пашкоджана расейскім, мужыцкім матампераматам. І калі сьвядомасьць беларусаў дарасьце да адпаведнага ўзроўню, то ня будзе пытаньняў, як зьвярнуцца адзін да другога. А я веру ў абуджэньне роднай нацыі.

Г. АСТРОЎСКІ.

● З ЗАЛЫ СУДА

САТЫСФАКЦЫЯ

ПАСЕДЖАНЬНЕ ПЕРШАЕ

Незвычайная судовая справа распачалася ў Кастрычніцкім нарсудзе Горадні. У суд, абараняць свае правы грамадзян, зьвярнуліся двое судзьдзяў і адвакат. Адказчыкам выступіла газэта «Гродненские новости». У № 55 (92) ад другога чэрвеня 1992 года газэта зьмясьціла артыкул пад назвай «Мафия в суде?», у якім аўтар Л. Даўгела спрабуе аналізаваць судовую справу, якая адбылася ў народным судзе Ленінскага раёна.

Ня маю намеру ў сваёй нататцы падрабязна пераказваць тое, аб чым пісаў Л. Даўгела, да таго ж, як высьветлілася, мой калега нават не карыстаўся судовымі матэрыяламі. А коратка заўважу, што гаворка там вядзецца аб тым, як нейкая сям'я Данільчыкаў пасьля разводу не дала рады без суда падзяліць сваю маёмасьць, а калі больш дакладна — аўтамабіль. Зрэшты, каго зацікавіць, зьвяртаю вашу ўвагу да вышэй упамянутага нумара «Гродненских новостей».

А я вяртаю вас у залу народнага суда Кастрычніцкага раёна, дзе абодва суддзі патрабуюць спазыск у газэты, кожны ў 150 тысяч рублёў і адвакат — 100 тысяч.

Найбольшае абурэньне супрацоўнікаў судовых ворганаў выклікала тое, што аўтар не прафэсійна, бездаказна адчёўся да справы, выкарыстаў факты толькі з вусных аповядаў аднаго боку, не зьвярнуўся ў суд, каб азнаёміцца з канкрэтнымі дакумэнтамі, паразмаўляць з самімі судзьдзямі і ўрэшце сваімі высновамі прылічыў іх да мафіі. Дарэчы, вось той абзац з тэкста артыкула: «... Кто устроил всю эту свистопляску? А судьи Э. Друц и И. Гришкевич. Их объединяет одна деталь: оба судьи — недавние выпускники юридического факультета Гродненского университета, то есть, ученики декана факультета И. В. Гущина. А декан, профессор права И. В. Гущин — адвокат истца И. Т. Курстака! Удивительно ли, что адвокат, он же наставник судьи, с легкостью выигрывает невероятно взболмошеное дело? Не знаю, как такое называется юридически, но в простонародье это зовётся МАФИЯ». І яшчэ адна выснова Л. Даўгелы, якая была ўспрынята прававедамі, як абраза: «... Суть дела примитивная, однако, это — ДЕЛО, и все при ДЕЛЕ, и все с этого ЧТО-ТО имеют. Если это не один из признаков мафии, тогда что же это такое?»

Пасьля апублікаваньня артыкула ў «Гродненских новостях» спазыстчыкі зьвярталіся ў рэдакцыю зь лістамі, у якіх прасілі абвергнуць звесткі, якія я ўжо ўзгадваў, і патрабавалі прабачэньня. Праз некалькі дзён газэта адказала, надрукаваўшы замест ліста І. В, Гушчына, але безь ніякіх прабачэньняў. У выніку чаго справа і апынулася ў судзе.

Усхваляваныя суддзі ўпэўнены ў знаёмых сьценах выкладалі свой спазыск, абураліся беззаконьнем ў прэсе так, што сакратарка суда ледзь сусьпявала занатоўваць усё ў пратакол. Адвакат І. В. Гушчын сьціпла, нешматслоўна заўважыў, што ўпершыню за доўгія гады працы даводзіцца абараняць самога сябе, бо калі верыць газэтнаму артыкулу, значыць, больш не працаваць у судзе, тым больш не выкладаць студэнтам.

Адказчык Л. Даўгела спазыск не прызнаў і яму далі магчымасьць давесьці суду, што ў сваім артыкуле ён мае рацыю.

Але якраз на гэтым месцы я пакуль спынюся. Л. Даўгела запатрабаваў у суд сьведку. Суд перапыніў паседжаньне да сёмага кастрычніка.

Спадзяюся, у наступным нумары «Пагоні» будзе магчымасьць паведаміць аб выніках гэтай незвычайнай справы.

М. КАРНЕВІЧ.

ПАЛІТЫЧНЫ ПРАГНОЗ

ДЗЬВЕ ВУШАНКІ, ПЯЦЬ ЦЮБЯЦЕЙКАЎ...

Здаецца, вяртаюцца часы «нового союзного договора». Цяпер выпусьцяць прыбалтаў і, трэба разумець, армянаў, грузінаў ды азэрбайджанцаў, трымаючы толькі на вайскова-нафтавым ланцугу. Украіна сягоньняшняй Расеі не па зубах, хаця краўчукоўскі «пераходны пэрыяд» троху зацягнецца з прычыны бальшавіцкага бардаку на самой Украіне, асабліва левабярэжнай. І застаецца ўсё тое ж, як і год таму назад: Беларусь, Расея, Казахстан, Узбэкістан, Кыргызстан, Туркменістан, Таджыкістан. Рублёвая зона...

На поўдні таксама пачынаюцца праблемы. Аўганская вайна перапаўзае на поўнач. Сьвкінуты таджыцкі прэзідэнт-камуніст, занепакоіўся узбэцкі... Ташкэнт — сэрца рэгіёну. Хто валодае Ташкэнтам, той правіць баль па ўсёй Сярэдняй Азыі. Калі ўпадзе рэжым Ісламa Карымава, а гэта можа здарыцца на працягу некалькіх бліжэйшых гадоў, Расеі застанецца адно з двух: альбо распачаць «другі Аўганістан», альбо адступіць на мяжу паміж Казахстанам і Сярэдняй Азыяй, як у свой час на кітайска-мангольскую мяжу. Тут магчымая акупацыя таксама Туркменістана ды Кыргізстана. Такім чынам, зь пяці цюбяцейкаў застаецца адна — казахская. Дый тая, гледзячы на 53 працэнты «русскоязычных», напалову вушанка.

Такая перспектыва. Беларусь, Расея і Казахстан, на поўдні якога патаемны ці адкрыты праваслаўна-ісламскі фронт. Беларусь з «партызанскай» ператворыцца ў тылавую: дай бульбу, дай мяса, дай жаўнераў, сядзі ды ня рыпайся. Адзінымі суцешанымі будуць хіба што спэцыялісты ад польска-кітайскага гандлю ці транзыту...

З Казахстанам увогуле цікавыя справы. Край багаты, але галоўным чынам рудой і збожжам — тут бяз мора аніяк, тут патрэбны транзыт чыгункай і аўтатранспартам, адных трубаправодаў для мангышлацкай нафты мала. Патрэбна Расея. З другога боку, на адраджэньне СССР казахамісьці нявыгадна — мігам накінуцца «браты» з поўдня, як на здраднікаў адзіна слушнай веры ў алаха... Будзе нейкі дзіўны, няўстойлівы баланс, які што казахскія, што расейскія палітыкі будуць ненавідзець, але аднaчасова будуць баяцца яго парушыць.

Ці будзе ў такой сітуацыі Расея пачынаць «вайну на два франты»?

Ці, адабраўшы ў страху за свае паўднёвыя межы рэальную незалежнасьць Казахстану, будзе дамагацца таго ж ад Беларусі?

Вось коратка сутнасьць болю галавы беларускай дыпляматыі ды беларускай палітыкі ўвогуле на бліжэйшыя гады. Здаецца, што сам-насам мы сапраўды шмат ня здолеем. Так, пачаўшы ад «цюбяцейкаў», нечакана выходзім на... ідэю Луцкевіча пра «балтыцка-чарнаморскі саюз», рэанімаваную тры гады таму Пазьняком!

Але рэальныя перспэктывы такога саюзу выглядаюць даволі цьмяна. Галоўнае будзе залежыць ад супрацоўніцтва Украіны ды Беларусі, а яшчэ невядома, ці ня будзе Украіна для нас новым «старэйшым» братам. Асобныя праявы гэтага ўжо ёсьць.

Такім чынам, падабаецца альбо не, але ў бліжэйшы час паўстане-такі «патройны саюз» — Беларусь+Расея+Казахстан. Вельмі цёплыя адносіны і дэманстраваная роўнасьць, вялікая нутраная падазронасьць і заблытаныя эканамічныя адносіны на справе — вось што гэта будзе. Ці ёсьць у Беларусі шанцы неяк абараніць у цісках такога блёку свой сувэрэнітэт? І якія шляхі такой абароны?

Па-першае, гэта інвэстыцыі ў гаспадарку Беларусі банкаў і кампаніяў з Аўстрыі, Германіі, Швэцыі. Маючы тут капітал, яны створаць у палітычных структурах сваіх краінаў «прабеларускае» лобі. У кожным выпадку абвастрэньня адносінаў з Расеяй гэтае лобі аўтаматычна будзе антырасейскім.

Па-другое, гэта дэмаркацыя й абсталяваньне ўсіх межаў, у тым ліку — з Расеяй. Справа ў тым, што адкрытая агрэсія ў цяперашніх умовах наўрад ці магчымая, значыць, падарваць адносны спакой на Беларусі можна адным спосабам: праз транзыт сюды «роста преступности», засылку крымінальных і мафіёзных элементаў.

Па-трэцяе, фарсаваньне рэалізацыі Закону аб грамадзянстве й выдача новых пашпартоў. Пасьля — дэмабілізацыя арміі, і звальненьне афіцэраў без грамадзянства альбо з чужым грамадзянствам.

Такая палітыка павінна забясьпечыць адносны спакой на бліжэйшыя тры-чатыры гады. Цяпер Расея ня пойдзе на адкрытую інтэрвэнцыю. Падарваць сувэрэнітэт Беларусі могуць два фактары: слабы ўрад і «пятая калёна». У будучым Рэспубліка Беларусь павінна больш цесна супрацоўнічаць з НАТО, мець на сваёй тэрыторыі, прынамсі, назіральнікаў і кансультантаў. Свая нават 100-тысячная армія ў выпадку чаго нас не абароніць, дастаткова мець удвая меншую, але з ракэтнымі комплексамі са звычайным зарадам, якія маглі б дасягаць расейскіх АЭС.

А ПАЎЛОЎСКІ.

МЯЖА — ВІЗІТНАЯ КАРТКА

Сёлета ў друку зьявілася паведамленьне аб тым, што для ўмацаваньня межаў у рэспубліцы будуць створаны памежныя войскі колькасьцю шэсьць тысяч асобаў. Прайшоў час, і аб тым, як адбываецца стварэньне памежнага войска, карэспандэнту «Пагоні» адказвае начальнік Гарадзенскага памежнага атраду Іван Дзьмітрыевіч Касавец.

Няма слоў, усьміхаецца спадар Касавец, мяжу абавязкова павінны кантраляваць і ахоўваць прафэсіяналы. Так робіцца ва ўсім сьвеце, дзе паважаюць сябе і міжнародныя нормы...

На жаль, са стварэньнем нацыянальнага памежнага войска й адпаведных добраабсталяваных межаў з мытнымі кантрольнымі пераходамі, на Беларусі спазьніліся на добры год з гакам. Можна зразумець фінансавыя цяжкасьці, але ж Вярхоўны Савет і ўрад бачылі, што дні СССР зьлічаны. Менавіта яны павінны былі правільна зпрагназаваць рух палітычных падзей і своечасова зрабіць адпаведныя фінансавыя й прававыя захады.

Сёньня ж нашу дзяржаву шматлікія спэкулянты й махляры ператварылі ў месца незаконнага гандлю. Сьцьвярджаць такое даюць падставу зьвесткі з кантрольных пастоў на ўсіх участках мяжы. Асабліва ўразіў апошні выпадак у Пінскім раёне Брэсцкай вобласьці, дзе на кантрольным пункце Нэвель затрымана за адзін раз на мільён рублёў беларускіх тавараў, якія вывозіліся ў суседнюю Украіну. Становішча будзе пагаршацца да таго часу, пакуль аматарскія пасты міліцыянтаў ня зьменяць вайскоўцы-памежнікі з добрай вывучкай, абсталяваньнем, якія будуць мець прафэсійны вопыт і адпаведныя канстытуцыйныя гарантыі. Гэта трэба рабіць тэрмінова, а ўрад пакуль што «сьпіць у шапку».

— Іван Дзьмітрыевіч, будаваць мяжу неабходна і, відаць, тут дарэчы асабістая ініцыятыва!

— Ініцыятыву добра выяўляць, калі ёсьць паўнамоцтвы і патрыятызм. Ні першага, ні другога не назіраецца. Таму што дагэтуль не распрацавана адзіная канцэпцыя памежных прац, не зафіксавана заканадаўча тэрыторыя, на якой мы павінны ўводзіць межы, будаваць жыцьцёвыя гарадкі, а гэта патрабуе неадкладнага рашэньня, бо толькі на нашым участку патрэбна збудаваць звыш двух дзесяткаў кантрольна-прапускных кропак, павялічыць кадравы афіцэрскі склад на 300 чалавек. А яны, афіцэры — людзі сямейныя, ім патрэбны кватэры, дзіцячыя садкі, школы, працоўныя месцы для жонак. У нас жа на сёньняшні дзень болей ста афіцэрскіх сем´яў жывуць у часовых, прыстасаваных пад жытло памяшканьнях. Выбраць месца і пачаць самастойна ўладкоўвацца няма сэнсу: нас адтуль выштурхае любы старшыня сельсавету.

— Скажам так: гэтыя пытаньні вырашаны. З чаго б Вы пачалі будову мяжы й войска!

— Выснова адна — неабходна дзейнічаць у некалькіх накірунках аднaчасова. Але падбор спэцыялістаў — справа першасная.

— На Беларусі няма ніводнай спэцыялізаванай вышэйшай навучальнай установы, якая б рыхтавала афіцэраў-памежнікаў!

— Пакуль што выкручваемся за кошт існуючага афіцэрскага корпуса. Зараз ёсьць дамовы на ўзроўні Саўміна зь кіраўніцтвам Расеі і Украіны — у іхніх вучылішчах нам будуць рыхтаваць кадравых афіцэраў.

— Скажыце, гэта будуць нашы беларускія хлопцы!

— Часткова так, а часткова і не.

— Навошта ж нам у Беларусі афіцэры-іншаземцы!

— Так вырашылі ўверсе, а мы толькі прымаем да вядомасьці.

— Але ж гэта ня выйсьце! Дзе будуць выхоўвацца нацыянальныя традыцыі беларускіх афіцэраў-памежнікаў!

— Вядома, неабходна будаваць у рэспубліцы сваю вышэйшую школу, дзе б курсанты прысягалі свайму народу, Радзіме, а не недзе на чужыне складалі прысягу іншай дзяржаве. Першыя такія крокі на Беларусі зроблены адносна падафіцэрскага — сяржанскага складу. У Смаргоні ствараецца вучэбны атрад, дзе прызыўнікі будуць праходзіць шасьцімесячныя курсы сяржантаў і старшыняў.

— Вы распавядалі пра кадры, а як Вам бачыцца мяжа!

— Абсталяваньне пунктаў кантролю і добраўпарадкаваньне мяжы, стварэньне матэрыяльна-тэхнічнай базы, наладжваньне гаспадарчых і спецыфічных сувязяў зь мясцовым насельніцтвам, будоўля застаў — цяжкае фінансавае выпрабаваньне дзяржаве. Ствараць мяжу шчыльнай няма сэнсу. Вялікія выдаткі не па кішэні рэспубліканскаму бюджэту. Лацьвей рабіць межы простымі, па прыкладу Эўрапейскіх краін — атрымаецца таньней, і будзе патрабаваць меней абслугоўчага пэрсаналу.

— А як рухаецца справа ў Горадні!

— Наш рэгіён мае адметныя ўмовы стварэньня добрых межаў. І найперш таму, што мы мяркуем з эўрапейскімі дзяржавамі.

— Гэта адзін бок, а як справы з матэрыяльнай часткай!

— І тут усё можа быць найлепш, зараз уздоўж мяжы зь Летувой, а канкрэтна на вядомым палігоне ад Гожы да Парэчча, вызваляюцца вайсковыя гарадкі былой Савецкай Арміі, іх можна плённа выкарыстоўваць не адзін дзясятак год. Толькі неабходна крыху патурбавацца парлямэнту і Саўміну, калі яны хочуць клапаціцца на справе, а не на словах, пра добрую мяжу.

Распытваў Г. АСТРОЎСКІ.

АДРАДЖЭНЦЫ,

1. Сябры мае, хачу закрануць у сваіх зацемках досыць далікатнае пытаньне. Маем багата прыкладаў, як пісьменьнікі набываюць сабе ворагаў амаль пасьля кожнае новай сваёй кнігі. Рэальныя асобы пазнаюць сябе ў кніжных гэроях, хоць, зразумела, прозьвішчы і адрасы зьменены. Журналістам яшчэ горай, яны мусяць усе дадзеныя прыводзіць цалкам праўдзівыя. Карацей, ворагаў у іх бывае процьма. Гэткая вось спэцыфіка працы.

Аднак нядаўна я парушыў гэтае правіла, калі пісаў нататкі з паездкі на «Басовішча». Ня стаў называць ані зь кім езьдзіў, ані — панатоў — прозьвішчаў. І хоць бы які намёк на якую канкрэтную асобу, але ж — не! Звычайна чытачу штось спадабаецца, штось — не, але пачытаў і адклаў убок: газэта жыве адзін дзень. Ёсьць і выключэньні з правілаў. Карацей кажучы, адна асоба, абражаная чамусь напісаным, пачынае прыдумваць усялякія куплеты на аўтара нататак...

Мяркуючы па зьмесьце, яна лічыць, што журналіст «зацясаўся» у шэрагі падарожных невядома як. Пачакайце, але аўтобус замаўляў фонд «Бацькаўшчына», дык чаму ж рэдактар газэты, якую фонд выдае, ня меў права ехаць? Мэта ў мяне была адна: напісаць аб паездцы, што я й выканаў. Далей куплетыстка папракае мяне ў тым, што я амаль не пісаў аб саміх канцэртах. Мілая пані, пра канцэрт напісаў іншы чалавек, я ж надрукаваў падарожныя нататкі, захаваўшы ўсе прыкметы жанру.

Шчодра атрымаў я іроніі і з прычыны таго, што ў часе сьпеваў быў у намёце... Аказваецца, мяне яшчэ й пільнавалі? Як гэта яшчэ аўтарка не ўказала разоў і калі я наведаў прыбіральню... Сапраўды, мяне ўразіла тое, што надта ж апантана некаторыя мае спадарожнікі кінуліся адно гандляваць, бо на першым «Басовішчы» такога не было. Ехалі ж, здаецца, на фэстываль. Менавіта для гандляроў фонд таксама ладзіць паездкі ў Беласток, але тады патрэбна даляры плаціць... Адным словам, нікога я не абразіў, не назваў таго, хто нас усіх затрымаў на дзьве гадзіны з-за рынкавай ліхаманкі. Аднак, ці бачыце, усё адно не дагадзіў.

Атрымліваецца, уперад як надрукаваць газэту, мы павінны абзнаёміць зь яе зьместам й запытаць згоды грамадзкасьці вобласьці? Выснова бязглуздая, але ці я сам гэта выдумаў? Чым займацца глупствамі і перашкаджаць нашай працы, лепей, сябры мае, дапамагайце нам, нясіце ў рэдакцыю нататкі, карэспандэнцыю, артыкулы. Усё вартае будзем друкаваць.

2. Яшчэ адной асобе, гэтым разам ужо службовай, не спадабаўся іншы артыкул. Яна мне тэлефануе і запрашае да сябе абмеркаваць нейкія яго палажэньні... Дзіва й годзе! Нібыта абкамаўскія часы вярнуліся. Я б яшчэ нейк мог зразумець падобнае, каб установа, адкуль мне тэлефанавалі, была выдаўцом «Пагоні». Але ж не! Нязгодны ты? Няхай сабе, колькі людзей — столькі меркаваньняў. Любіш Сталіна? Дык любі сабе...

БЮРАКРАТЫ,

Даўней да журналістаў у нас ставіліся, як да «прывадных пасаў» партыі. Потым аказалася, яны «вінаваты». Што праўда пра бальшавіцкія жахі вылезла, як шыла зь меха. Сёньня таксама любяць іх патурукаць, панавучаць, абазваць як-небудзь. Чаму ж і не, калі ў іх зарплата як, напрыклад, у грузчыка гарадзенскага вінкамбіната? Мала плоцяць, значыцца няма за што , не заслужылі.

Зрэшты, як сабе хочаце, але й у нас прэса паступова робіцца тым, чым яна ёсьць у цывілізаваным сьвеце, дзе яе з павагай называюць «чацьвертай уладай». З прэсай лічацца й у нас, так урэшце калісьці будзе. Вядома, адукацыя ў нас ня тая, кругагляд пакуль завузкі. Сарбонаў не скончалі, Новыя Ёркі не наведвалі. Аднак і ў нас дэмакратычная прэса ёсьць сумленьне нацыі і калі ня стала яшчэ чацьвертай уладай, дык стане ёй. А пакуль паведамляю: сьпевы пад габінэтную дуду, стаяньне на казённых кілімах — усё гэта не для нас, памыліліся адрасам.

3. Трымаю ў руцэ ліст ад чытача. Штось-штось знаёмае. Га! Аднойчы, узяўшы тэлефонную слухаўку, я пачуў: «Ты, б... ! фашист, когда, наконец, прекратишь свою деятельность?!». Гэтыя фокусы працягваліся колькі дзён, а цяпер вось — ліст. Дык што ў зьмесьце! Мой расейскі чытач, дарэчы — гарадзенец, заўважае ў мяне ў сувязі з «оболганным» мной «гением полководца Суворова» «патологическую ненависть ко всему русскому». Чытацкія высновы досыць радыкальныя: «Здесь, по-видимому, тот простой случай, когда надо обратиться к врачам за помощью или открыто возглавить партию типа господина Жириновского»...

Вось табе й маеш! Мой апанэнт лічыць, што беларусаў не павінна цікавіць тое, на якой мове шыльды і як названы вуліцы, а інакш, маўляў, будуць у нас трагэдыі накшталт Карабахскай і Прыднястроўскай, далей ён страшыць «сотнями трупов» — як у Югаславіі, Асетыі і Абхазіі... Карацей, усё расьпісана паводле таго самага Жырыноўскага, які багоміць таксама Суворава, які супраць усяго беларускага, ўкраінскага і г. д. Заўважу: ні адзін яшчэ сьвядомы беларус нікога і ніколі не страшчаў тымі карабахамі. Усё гэта прэрагатыва нашых старэйшых братоў. Адкуль жа іхняя сьлёзнасьць па далёкай Югаславіі! Усё адтуль жа. Кроў тамака ліецца, «дзякуючы» вялікадзяржаўніцкай Сэрбіі, якой у выпадку аддзяленьня іншых рэспублік не заставалася кім кіраваць. У былым СССР адпаведнік Сэрбіі — Расея. Ці гэта можа таксама мае прыдумкі? Палітычнае жыцьцё аднак пацьвярджае выснову і жандарскія звычкі ўсходняга суседа, вельмі відавочныя сёньня.

Аднак старэйшаму брату бервяно ў воку не перашкаджае, яму карціць усё беларуса безгаловага навучаць. Ну, вось, напрыклад, нас павінна адно турбаваць, калі капаць бульбу, курс даляра й тое, ці можна аддаць «Куриллы» Японіі (!). А можа, й Ганконг? Ці можна яго аддаваць законнаму ўладальніку — Кітаю?! Не, дзядзя, ня

СТАРЭЙШЫЯ БРАТЫ...

дуры ты нам галаву, а лепей мяне паслухай. Перадусім, трэба паважаць Краіну, дзе жывеш і хлеб жуеш. А называецца яна Беларусь, а не Курылы або Расея. Падругое, я асабіста пішу пра сваю Бацькаўшчыну, пра тое, што мне баліць. Мне нават не прыходзіць пры гэтым да галавы ехаць куды-небудзь у Тамбоў і вучыць тамбоўцаў таму, якія ў іх павінны быць шыльды й не дакучаць ім з праблемай якой-небудзь Пізанскай вежы, бо іх жа, напэўна, турбуе іншае: галеча Нечарназем´я або тыя ж самыя Курылы.

Я аднолькава жадаю працьвітаньня любому народу: рускаму, мальгатскаму, любому. Шаную любога чалавека, пакуль ён паводзіцца са мной на роўных, а ня пнецца павучаць мяне, абражае, абвінавачвае. Такім чынам, каб цябе паважалі, шаноўны сябра, трэба хаця б быць сьціплей. Мы самі ведаем, хто для нас добрым быў: Сувораў або наш Касьцюшка. Памятаем і прарочыя словы нашага нацыянальнага гэроя Кастуся Каліноўскага аб тым, што Беларусь датуль будзе паднявольнай, пакуль будзе заставацца пад маскалём. Іван Жахлівы, Пётра І, Сувораў, Мураўёў-вешальнік — усё гэта вашыя гэроі, а для нас — ворагі, каты. Годзе кашчунстваваць з памяці беларусаў...

С. А.

Папулярна-навуковыя занатоўкі

БЕЛАРУСКАЯ ВЕРА:
PERSONA NON GRATA

З ГЭТЫМ Вялікім Княствам Літоўскім, як вядома, шмат было ўсялякіх непаразуменьняў. Беларусам адвялі сціплую ролю непісьменных, прыгнечаных мужыкоў, зь якіх усяляк зьдзекваліся літоўскія ды польскія фэадалы-магнаты. Зацкаванаму беларусу не заставалася нічога, апроч як спаць і марыць аб тым, каб ВКЛ захапілі «нашыя» — маскоўскія, праваслаўныя, добрыя цары. У БССР гэтая расейская вэрсія да 1991 г. заставалася асноўнай. Тых нешматлікіх навукоўцаў, якія спрабавалі пярэчыць, дружна цкавалі, зухава абзываючы «нацдэмамі», «нацыянал-фашыстамі» і г. д. Тым часам нашыя нясьціплыя суседзі прысябечылі сабе ўсё і ўсіх, нават Фр. Скарыну.

Знамянальна, што ледзь сканала БССР, у кастрычніку летась у нашае Горадні адбылася ўпершыню міжнародная навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Тады ж было дамоўлена зрабіць навуковыя чытаньні штогадовымі. Сёлета, 28—30 верасьня адбылася наступная канфэрэнцыя, прысьвечаная гісторыі і культуры народаў ВКЛ і Беларусі XIII — пачатку XX ст. Такім чынам акрэсьліваюцца асобныя сфэры жыцьця дзяржавы і беларусам нарэшце знаходзіцца ў ёй месца, прычым зусім не сціплае. Летувіскія калегі, напрыклад, адчуваюць сябе ніякавата, чуючы аспрэчаньні накшталт «Чаму вы называеце Сапегаў і Хадкевічаў літоўскімі магнатамі? Адкуль вы ўзялі рускае насельніцтва ў Княстве?» і г. д. Бо адказаць ім няма чаго. Старыя стэрэатыпы сёньня ёсьць анахранізмам. Праваслаўны сьвятар усю гісторыю ВКЛ і праваслаўнай царквы тлумачыць з усходніх пазіцый, а ў адказ на закіды ў прамаскоўскай арыентацыі не знаходзіць іншага «алібі», як тое, што ён — з кубанскіх казакаў.

Але мы забеглі наперад. Госьцяў з Польшчы, Летувы, Расеі, Украіны разьмясьцілі ў гатэлях «Горадня» і «Беларусь», пасьля чаго паказалі Стары горад. Назаўтра, у панядзелак 28-га яны сабраліся ў тэатры А. Тызэнгаўза. 200-гадовая камяніца, дарэчы, рэстаўруецца й пачынае набываць унутры ўласьцівы выгляд, са сцэнаў зьніклі казачныя сцэны зь Ямелямі-прасьцякамі, Іванамі-дурнямі й дзеўчынамі ў какошніках... Усе ўдзельнікі ўжо зарэгістраваліся. Падыходжу да столікаў з самавітымі шыльдачкамі: Польшча, Летува, Японія, Швэйцарыя. На жаль, японскія багасловы спадары Масару Сата і Кэйка Сата не прыехалі. Затое не адмовіла ў запрашэньні спадарыня Моніка Банькоўская — Зульліг з Цурыха (гутарку зь ёй мы надрукуем у наступным нумары газэты). Зазіраю ў сьпісы: навукоўцы, журналісты. З прадстаўнікоў сталічнае прэсы я сустракаў аднак аднаго Вітаўта Чаропку, рэдактара часопіса «Хрысьціянская думка». Прадаюцца тры зборнікі дакладаў «Радавод»: 150 руб. для ўдзельнікаў, 200 — для ўсіх астатніх. Мне ўручаюць памяткавы кэрамічны мэдаль.

НА АДКРЫЦЬЦІ канфэрэнцыі ня было леташняй пампэзнасьці. З запрошанага начальства амаль ніхто не прыехаў. Летась нават быў даслаў віншавальную тэлеграму ажно з Аўстраліі міністр замежных справаў сп. Краўчанка. Цяпер канфэрэнцыя ад самага пачатку мела рабочы характар. Прафэсар А. Мальдзіс уручыў мэдаль Эўфрасіньні Полацкай галоўнаму каардынатару канфэрэнцыі дацэнту-гісторыку сп. Дз. Караву. Яшчэ адзін такі мэдаль ён прывез і для кіраўніка Гарадзенскае філіі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў — прафэсара Сьцяцко. Потым госьць паведаміў аб тым, што налета ў Горадні адбудзецца міжнародная канфэрэнцыя «Рым-IV» і пажартаваў з вядомага сцьвярджэньня аб тым, што «Масква — трэйці Рым, а чацьвёртаму ня быць». Маўляў, Менск зрабіўся сталіцай СНД і як бы 4-м Рымам. Вось, а Горадня — другой культурнай сталіцай Беларусі...



Як вядома, пачаткова «Рым-IV» меркаваўся ў Пінску, але адрас быў зьменены праз тамтэйшых «паляшуцка-яцьвяжскіх» сэпаратыстаў. Бадай што слушна. У Горадні ёсьць што прапанаваць замежнікам: архітэктура, добрыя музэі, унівэрсітэт, яшчэ існуюць дзьве вышэйшыя навучальныя ўстановы, гэтаў, у нас шмат навукоўцаў і краязнаўцаў, моцныя гістарычныя традыцыі, нарэшце ў горадзе за апошнія гады назапашаны вопыт правядзеньня падобных мерапрыемстваў. А што ў тым Пінску? Вылезе на трыбуну якісь мястэчковы палітык і пачне галаву дурыць...

Прафэсар А. Мальдзіс цікава распавёў аб тым, як дзеля пошукаў беларускай сьвятыні — крыжа Э. Полацкай — балгарскія беларусісты зьвярнулі да вядомай Вангі і яшчэ адной прарочыцы, імя якой ён не пажадаў назваць, а таксама — аб атрыманых ад прарочыцы адказах. Паводле іхніх словаў сьляды крыжа будуць знойдзены да канца г. году. Што ж, пачакайма. Спадар Мальдзіс выступіў й з дакладам. Ён, у прыватнасьці, сказаў: «Калі адраджэньне хрысьціянства, духоўнасьці будзе адбывацца на Беларусі не на нацыянальнай глебе, дык гэта, што тут ўтойваць, зможа прывесьці ў будучыні да канфрантацыі,, да таго, што зараз адбываецца ў былой Югаславіі. Мне здаецца, што паяднаньне хрысьціянскіх канфэсій на Беларусі можа адбыцца толькі на нацыянальнай глебе. Да таго часу, пакуль тое або іншае веравызнаньне на Беларусі будзе адстойваць, міжвольна або сьвядома, палярызуючыся, інтарэсы іншых дзяржаў і іншых этнасаў, да гэтага часу, мне здаецца, духоўная адраджэньня на Беларусі не будзе».

Далей ён зазначыў, што пазіцыя гарадзенскай газэты «Глос з-над Немна» у гэтых пытаньнях нібы ў цэлым канструктыўная, але яго засмучаюць сьцьверджэньні накшталт «Калі ў касьцёлах няма польскай мовы, то тады, маўляў, няма й выбару. Ну, а што тады рабіць каталікам-беларусам — хацелася б спытаць у рэдакцыі.— Яны таксама павінны мець выбар... Не натуральна, калі ў тых парафіях Гарадзеншчыны, а я іх праехаў добры дзясятак, у выключна беларускіх парафіях ёсьць выбар, вядома, у літаратуры, скажам і ў казанях, але гэты выбар такі: польская мова або руская. А чаму беларусы, карэнная нацыя, мова якіх зьяўляецца дзяржаўнай, не маюць права на свой выбар?..»

Цікавым мог бы стаць даклад прафэсара Беластоцкай філіі Варшаўскага унівэрсітэта сп. А. Садоўскага, дарэчы — вельмі прагліцы, «Рэлігія і народ у сфэры памежжа». Успомніўшы нават народы Мэксікі, Бразіліі, Індыі, аўтар аднак не наважыўся закрануць насельніцтва гарадзенска-беластоцкага памежжа. Бо аналогіі напрошваюцца хутчэй з ірляндцамі, якіх крыху ўзгадаў беластоцкі вучоны. Тых самых ірляндцаў, якія, як і большасьць беларусаў, вывучаюць родную мову ў школе, але размаўляюць па-ангельску і якія ў Паўночнай Ірляндыі, адарванай ад астатняй, падзелены на каталікоў і пратэстантаў, як беларусы — на каталікоў і праваслаўных. Але сьмелы крок зроблены ня быў, й дыскусіі не адбылося.

НАЙГАЛОЎНАЯ прыкмета цяперашняй канфэрэнцыі — выбух цікавасьці да зьняслаўленай, абылганай, апляванай уніяцкай царквы. Пры расейскай, а потым савецкай імпэрыях тэма гэтая на Беларусі была забаронена. Дазвалялася хіба, як і ўсё беларускае, паліваць вунію брудам, бо гэтага вымагалі правілы «этыкету», гэтак можна было дагадзіць Маскве, атрымаць месца каля карыта... Гарадзенскія унівэрсітэцкія навукоўцы, у прыватнасьці, даводзяць у сваіх дасьледаваньнях, што вуніяцкая царква спрыяла самавызначэньню беларусаў і захаваньню ў неспрыяльных умовах беларускай мовы (Т. Мікуліч) і давала падставы пазьней, пасьля гвалтоўнага скасаваньня вуніі, К. Каліноўскаму абапірацца ў «Мужыцкай праўдзе» на яе, як на беларускую нацыянальную, адрозную ад прапольскага каталіцтва і расейскага праваслаўя, царкву (У. Разэнфэльд і Г. Шчалбаніна). Відушчасьць нашага нацыянальнага гэроя не выклікае сумненьня. Вельмі дарэчы тут будзе ўспомніць верш Фр. Багушэвіча «Як мяне хрысьцілі ў палякі»...

Тым жа часам у іншых дакладах вельмі яскрава прасочвалася ісьціна аб пазьнейшай гісторыі праваслаўнае царквы на Беларусі, як аб чыста палітычнай барацьбе. Нас увесь час дзялілі й дзеляць да сёньняшняга дню на сфэры ўплыву Варшава й Масква. Любая хрысьціянская царква можа быць добрай для беларусаў, калі яна будзе беларускай, будзе яго кансалідаваць, а не разрываць на часткі. І сёньня гэта асабліва актуальна. Нездарма ж на канфэрэнцыі ўсчаліся вельмі гарачыя спрэчкі пасьля выступленьня Г. Сурмач зь Менску аб нацыянальна-адраджэнскім руху і праваслаўнай царкве ў Заходняй Беларусі... Калі б справа маскоўскім іярархам і іхнім стаўленікам у нас ішла аб веры, а не аб палітцы, пытаньне магло вырашыцца элемэнтарна: царква б стала аўтакэфальнай і беларускай. Божачкі, колькі ж чуем ляманту з прычыны сэпаратызму Украінскай праваслаўнай царквы! У чым прычына? У тым, што пасьлабляецца ўлада Масквы. Здаецца ж, існуе адных расейскіх царкваў тры ці чатыры, Армянская, Грузінская, Румынская, Балгарская і г. д., існуюць аўтакэфальныя ў Польшчы, іншых краёх. Хай была б і Украінская. Заўважу: пазіцыі праваслаўя ў сьвеце ад гэтага не слабеюць, а наадварот, узмацняюцца. Але ж мы бачым у адказ адно нянавісьць, хлусьцю, пагрозы. Значыцца, нашых маскоўскіх дабрадзеяў цікавіць ня вера, а палітыка. Дык хай жа будуць хоць спакойныя за Беларусь, якая надзейна прышпілена да ўсходняга суседа. Сыпце спакойна, сябры.

Скончылася канфэрэнцыя сяброўскай сустрэчай у рэстаране «Беласток». Кажуць, госьці былі вельмі ўражаны беларускай гасьціннасьцю й засталіся задаволеныя побытам у Горадні.

І. ПЯТРОЎ.

На здымку: удзельнікі канфэрэнцыі.

Фота У. ВЫДЗЭРКІ.

НАЕЗД ✦ ВЫБРАНЦОЎ

Белы сьцяг з манаграмай з дзьвюх пераплеценых літар лацінскай «W» і «S» — такі сымболь маладзёжнай арганізацыі «Выбранецкія шыхты». Група яе сяброў 19 і 20 верасьня была ў Горадні.

Дзейнасьць «Выбранецкіх шыхтоў» разнастайная: культурна-асьветніцкая, выдавецкая, камэрцыйная, бо трэба зарабляць на свае імпрэзы самім. Назва паходзіць ад традыцыі набіраць частку войска старабеларускай дзяржавы зь юнкоў, выбраных ад 20 двароў дробнай шляхты ці сялян.

Сёньняшнія «выбранцы» ўзялі на сябе абавязак зьбіраць, ратаваць і бараніць здабыткі нацыянальнай культуры як у краі, так і на этнічных беларускіх землях сумежных краін (Смаленшчыне, Пскоўшчыне, Браншчыне, Віленшчыне, у Латвіі і інш.). Збор фальклору, апісаньне помнікаў дойлідства і помнікаў, дасьледваньне фактаў далёкай і нядаўняй гісторыі, наладжваньне музычных фэстаў і народных сьвятаў — вось няпоўны пералік заняткаў «выбранцоў».

У Гародню іх запрасілі скаўты. Пад час візіту выбранцы наведалі парэцкі зьвяз, дзе правялі зь дзецьмі некалькі вясёлых гадзін у сьпевах, танцах і гульнях. Другі дзень быў прысьвечаны сустрэчы з гарадзенскімі скаўтамі і знаёмству з Горадняй.

У сваёй музычна-сьпеўнай мэтодыцы «Выбранецкія шыхты» маюць адметна вызначаны стыль, як у выкананьні, так і ў падборы твораў. У прыватнасьці ў нас яны выступалі з такім рэдкім матэрыялам, як беларускі ваярскі танец і сьпеў. Пад час сваіх канцэртаў выбранцы вельмі ўдала і хутка ўцягваюць у гульні і танцы дзіцячую аўдыторыю. Калі напачатку дзеці цiснуцца па сьценах і кутках, то неўзабаве стараньнямі выбранцоў усе весяляцца разам. Сёньняшнім дзецям не стае як раз гэтага.

Варта павучыцца ў выбранцоў яшчэ аднаму: апантанай беларускасьці і непахіснай веры ў нашае адраджэньне. А наладжаныя імі вандроўкі — гэта сапраўдная школа юнацкага гарту і патрыятызму.

Кіруе «Выбранецкімі шыхтамі» сп. Ігар Міхно. Вакол яго гуртуюцца разумныя хлопцы і вельмі пенкныя дзяўчаты. Шкада, калі вы ня чулі і ня бачылі іх. Але выбранцы абяцалі яшчэ раз наведаць нашу каларытную Горадню на пачатку сьнежня, каб спаткацца са студэнтамі, скаўтамі і іншымі сябрамі іх назвыклага таленту.

А. Д.

SOS

ЦІ ПАВЯЛІЧЫМ НАЦЫЮ?

Нядаўна давялося чуць размову маладых кабет. Уразіла тое, што абедзьве сяброўкі ня першы год у шлюбе і дагэтуль ня маюць аніводнага дзіцяці. На жаль, ня толькі вышэйпамянёныя асобы жадаюць быць бязьдзетнымі.

Чаму такое адбываецца з нашымі кабетамі, карэспандэнт «Пагоні» паспрабаваў распытаць галоўнага ўрача радзільнага дому ў Горадні А. А. Рамашку.

— Па-першае,— апавядае Аляксандр Аляксеявіч,— гэта адбываецца таму, што жанчыны адчулі сябе падманутымі сістэмай. Узгадайце сабе нядаўняе: «Савецкая жанчына роўная з мужчынам і ёй адчынены ўсе накірункі дзейнасьці». Яе можна запіхваць у шахты, у мартэны, на лесаразпрацоўкі ў Сібіры. Шкада, але да гэтага жанчына прызвычаілася, прычым не без уплыву ворганаў друку, літаратуры. Успомніце «Узьнятую цаліну», гэрой якой — Нагульнаў — гатовы быў нават сам... нараджаць, калі так загадае партыя.

Вось такая прафанацыя й давяла да таго, што ў «камуністычным» грамадзтве ўсе лічыліся працоўнай сілай — матэрыялам для зьдзяйсьненьня «мировой революции». Усім падалося, што трэба толькі працаваць і выконваць дырэктывы партыі, а гома-сапіенс выгадуецца і ў лябараторыі.

— Спадар Рамашка, няўжо ва ўсім вінавата былая сістэма?

— Я не абвінавачваю сістэму ці кантрэтную асобу, бо я не праўнік, але варункі, якія стварыла сістэма для існаваньня, відавочныя, я лічу іх шкоднымі. Зразумейце: у душы сучаснай жанчыны адбылася з-за шматгадовай дэзінфармацыі зьмены. Наша жанчына здрадзіла высакароднаму памкненьню быць маці, яна імкнецца ў шахтавы забой...

— Вы сказалі, што нашых кабет падманула сістэма, у Вас ёсьць прыклады?

— Прыкладаў хоць адбаўляй. Вось канкрэтны: у Горадні плянавалася збудаваць пэрынатальны цэнтр на 560 месцаў. Справа была ўзгоднена зь Міністэрствам аховы здароўя і навукова-дасьледчым інстытутам «Гіпраздраў» горада Рыгі, дзе рыхтавался праэктна-сьметная дакумэнтацыя. Па задумцы аўтараў праэкта, гэта было зьвышсучаснае памяшканьне на дванаццаць паверхаў. У ім цяжарных жанчын чакалі б самыя лепшыя ўмовы захаваньня цяжарнасьці і непасрэдна нарадзінаў. Але тры гады таму ўлады адмовілі ў фінансаваньні праэкта. Абыякава сказаўшы, што для гараднянак гэта будзе занадта вялікай раскошай. Вось так аднесьліся «народныя абраньнікі» да сваёй будучыні. Ці ня іхнія «турботы» панізілі ўзровень нараджальнасьці толькі ў Горадні бадай на палову?

Наша даведка. Зараз за адны суткі ў Горадні нараджаецца 10—12 немаўлят. Для параўнаньня: у мінулым годзе іх нараджалася 24—26.

— Што яшчэ адмоўна адбілася на колькасьці народзін?

— У горадзе на некалькі тысячаў павялічылася чарга на жытло. Маладыя сем'і з трох-чатырох чалавек жывуць у маленькіх інтэрнацкіх пакойчыках, дзесяцігоддзямі чакаючы сваёй чаргі на жытло. А ўзяць рост цэнаў, гіпэрінфляцыю... Хіба няма ў гэтым віны ўчарашніх кіруючых структур, якія ў супрацьстаяньні ўсяму сьвету ільвіную долю ў бюджэту аддавалі ВПК?

— Ці ёсьць якоесь выйсьце для беларусаў? Ці, можа, нас так і застанецца дзесяць мільёнаў?

— Пакуль што хуткага выйсьця ня бачу, але яно адно: укладаць грошы ў разьвіцьцё сацыяльнай сфэры, будаваць жытло, шпіталі, дзіцячыя садкі, аднасіцца да мацярынства зь вялікай павагай, і ўвогуле да нараджальнасьці неабходна ставіцца па-дзяржаўнаму. Толькі тады можна разьлічваць на пазытыўныя вынікі.

Гутарыў Г. АСТРОЎСКІ.

Музычная паўза

ГОРАДНЯ ЗАСЫНАЕ ПАД ГУКІ РОК-Н-РОЛА

Так ужо здарылася, што нашае агульнае выхаваньне, наш лад жыцьця прымусілі нас стаць прыхільнікамі ўсяго штучнага, не заўсёды сапраўднага, далёка не эстэтнага. Гэта тычыцца нашага побыту, нашае працы, нашага адпачынку. Нават нашае мысьленьне не заўжды дазваляе нам адчуць і ўбачыць сапраўдныя каштоўнасьці ў тым, што знаходзіцца вакол нас.

У апошнія гады Горадня не пакутавала ад недахопу канцэртных гастралёраў. Нават у такой тэлевізійнай перадачы Астанкіна, як «Шоу-біржа», вядучыя нярэдка называлі наш горад у сувязі з чарговым сэйшанам якога-небудзь «Тяжелого февраля» ці гуртка Кірзева, якія, ужо стаміўшы маскоўскіх і піцерскіх слухачоў, вырашалі падацца на перыферыю магутнай і неабсяжнай імпэрыі. І тады ў Горадні стаяў вэрхал, поўныя залы і стадыёны з замілаваньнем і млоснасьцю слухалі далёка ня добрай якасьці фанаграмы і назіралі, як гастралёры, забыўшыся на павагу да гледачоў, «на расслабоне» адбывалі на сцэне свой час. А калі зьяўляецца магчымасьць пачуць і ўбачыць сапраўднае мастацтва, жывое, «нефанэрнае», то неяк і не да гэтага, бо ўрэшце рэшт трэба мець хаця б сьмеласьць стаць крыху вышэйшым за ўсімі паважаную штучнасьць.

27 верасьня ў Горадні адбылася тусоўка, якую ладзілі беларускі гурт «Уліс» і гурт зь Нямеччыны «Фрэнцік клаб». Імпрэза зьявілася лягічнай састаўной часткай альтэрнатыўнага канцэртна-гастрольнага руху, які паўстаў на Беларусі ў гэтым годзе. Музыкі «Уліса» прыйшлі да думкі стварыць альтэрнатыву існуючаму музычнаму істэблішмэнту. Гэтая думка нядоўга блукала ў паветры і пры дапамозе вядомага музычнага крытыка з Масквы Арцёма Троіцкага і летувіскай фірмы грамзапісу ў Менск былі запрошаны брытанскія гурты «Нідзэр ЭБ», «Мека» і канадзкі выканаўца Дэйвід Говард. Спонсарам музычных фэстаў выступіла фірма «Дайнова», кіраўнік якой зацікаўлены ў тым, каб на нашай зямлі адраджаліся традыцыйныя і разьвіваліся новыя напрамкі беларускай культуры. У чэрвені «Уліс» і яго сябры далі магчымасьць менчукам даведацца, што такое беларуска-ангельска-канадзкі рок вышэйшага гатунку. Гэта быў сапраўдны фурор.

Такія канцэрты вырашана было ладзіць па два разы на квартал. І вось нарэшце Горадня, а за ёю Ліда і Слонім прычакалі прыходу музычнага сьвята.

Рок-гурт «Уліс». Пра яго ўжо напісана і сказана столькі, што нешта новае прыдумаць цяжка. Хіба толькі сказаць, што ў Варшаве існуе фан-клуб «Уліса», кружэлкі гурта з посьпехам прадаюцца ў музычных крамах Мюнхэна, Варшавы, Масквы, артыкулам аб творчасьці гурта і яго фота можна сустрэць на старонках цэнтральных нямецкіх газэт і часопісаў. Ды яшчэ не магу не сказаць, што «Уліс» стаўся першым беларускім рок-гуртом, які свой альбом «Краіна доўгай белай хмары» выдаў у лічбавым запісу. «Улісы» і пачыналі канцэрт. Цікавы, своеасаблівы вакал новага вакаліста Алега Тамашова, вядомыя гіты «Эрусалім», «Чужаніца», «Лязо», сола Вячкі Кораня, гітара якога зачароўвае, прымушае жыць гукамі, закранае нешта ў табе — і ўжо ніколі ня быць абыякавым да той зьявы, што мае назву «Уліс».

Гурт «Фрэнцік клаб» зь нямецкага горада Аўгсбурга. Год заснаваньня — 1989. Музычны накірунак — па вызначэньню спэцыялістаў — «мэйнстрым» року, але, як заўважылі самы музыкі, яны граюць простыя і завадныя рытмы рок-н-ролу, часам хард-рок. «Фрэнцік Клаб» перакладаецца як «клюб вар ятаў» або «суполка шызанутых», аднак, як паказала выступленьне, хлопцы граюць музыку нармальных людзей, прычым музыку мельмі высокага ўзроўню. Першыя словы прывітаньня вакаліста «ФК» Пітэра Арнта, першыя акорды — і моладзь кінулася да сцэны. Рок-н-рол — гэта жыцьцё, гэта імпэт, гэта рух. І ў зале ніхто не сумаваў. Дарэчы...

Дарэчы, пра залу. На канцэрце былі тузін гарадзенскіх рокавых музыкаў, дзесяткі два навучэнцаў ПТВ, некалькі маладых пар, якія дазволілі сабе раскошу паслухаць сапраўдную музыку, і працаўнік Палаца культуры «Юнацтва», які, па былой звычцы, кінуўся сьпярша да хлапцоў, што таньчылі паміж сцэнаю і гледачамі, але потым, зразумеўшы, што музыка і маладосьць — гэта не абавязкова хуліганства, сеў і спакойна слухаў песьні. Вось амаль што і ўсе, хто быў па гэты бок сцэны.

Імпрэза доўжылася амаль тры гадзіны. Пад канец «Уліс» і «Фрэнцік клаб» выканалі разам вядомы ўлісаўскі хіт «Радыё Свабода».

У песьні «Горад скарбонак», што напісаў вакаліст «ФК» Пітэр Арнт, ёсьць такія словы:

Ты жывеш у невялікім мястэчку
І не заўважаеш,
Што ты — толькі частка гэтага сьвету,
гэтай машыны.
Людзі мараць і сьпяць...

Я вяртаюся з канцэрта дамоў. У сваіх кватэрах людзі рыхтаваліся да наступнага працоўнага дня, у якім, як заўжды, будзе звыклая праца, звыклыя людзі, звыклыя словы, звыклыя пачуцьці. Горадня клалася спаць, і ў халодны верасеньскі вечар гукі рок-н-ролу з палаца «Юнацтва» былі для яе калыханкай. Нячутнай, незаўважнай калыханкай для гэтага горада, у якім людзі мараць аб лепшым прыгожым жыцьці, а калі здараюцца рэдкія хвіліны такога жыцьця, калі самы час пайсьці яму насустрач, яны проста кладуцца спаць. У надзеі, што жыцьцё гэтае пачакае да заўтра, да пасьлязаўтра...

С. ЛАЎНІК.



Размовіца

«БЕЛАРУСЬ ПАЎСТАЛА ЯК НОВЫ КАНТЫНЭНТ»

Сёння мы прапануем вам гаворку Сяргея Лаўніка з навукоўцам са Злучаных Штатаў Амэрыкі, славістам, беларусістам Куртам Вулхайзэрам.

— Курт, калі ласка, некалькі словаў пра сябе.

— Што тычыцца майго паходжаньня, яно нямецкае. Але часткова, бо ў мяне былі продкі з Нарвэгіі, Даніі, Англіі. Так што я тыповы амэрыканец. Вучуся ў асьпірантуры ва унівэрсітэце Індыяна штата Індыяна, займаюся славістыкай.

— Чаму цябе зацікавіла менавіта беларусістыка, і калі ты пачаў ёю займацца?

— Яшчэ ў студэнцкія гады зацікавіўся гісторыяй друкаваньня ў славян і асабліва выданьнямі Францішка Скарыны, бо яны, аздобленыя вельмі прафэсыйна, не былі падобныя на іншыя друкаваныя кнігі. Якраз тады я пачаў займацца беларускай мовай. Потым ужо мне ў рукі трапіла кніга нарвэжскага славіста Станга пра мову канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага, і мяне захапіла гэтая тэматыка, тым больш, што ў нас ніхто гэтымі пытаньнямі не займаўся, бо пакуль што ва унівэрсітэце Індыяна няма беларусістыкі як спэцыяльнасьці.

— Якімі навуковымі крыніцамі, дапаможнікамі ты карыстаўся пры вывучэньні беларускай мовы?

— Я пачаў вывучаць беларускую мову з дапамогай падручніка Пашкевіч. Гэта падручнік па беларускай мове для англамоўных навучэнцаў, у якім граматыка тлумачыцца на ангельскай мове, а аўтар прытрымліваецца дарэформенных нормаў.

— Ты прыехаў як прыватная асоба ці гэта ў цябе творчая камандыроўка?

— Я прыехаў па запрашэньню Міжнароднай школы беларусістыкі, якая ў жніўні працавала ў Менску. Навукоўцы з розных краін мелі магчымасьць паслухаць цікавыя лекцыі лепшых беларускіх моваэнаўцаў, гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, пабылі ў гістарычных мясьцінах Беларусі, урэшце рэшт пазнаёміліся адзін з адным. Для мяне асабіста вельмі значным было знаёмства з прафэсарам з Аўстрыі Гэрманам Бідэрам і, як ні дзіўна, але зь ім мы размаўлялі толькі на беларускай мове, бо так сталася, што яна ў нас была адзінай агульнай мовай. Так што, як бачыце, беларуская мова можа быць моваю міжнацыянальных зносін.

— А зь якой нагоды ты зараз у Горадні?

— Я вырашыў напісаць доктарскую дысэртацыю аб гаворках беларуска-польскага памежжа. Таму і прыехаў у Горадню, каб зьбіраць тут матэрыялы. Мне ўдалося пабыць у Сапоцкіне, дзе яшчэ жыве польскамоўная гаворка, праўда на беларускім субстраце. Дарэчы, трэба сказаць, што ў мове Адама Міцкевіча сустракаецца шмат якіх адметных словаў, якія ўжываюць у Сапоцкіне. Мне да таго ж пазычылі запісы дыялектнай мовы, зробленыя студэнтамі факультэта беларускай філалогіі і культуры ГрДзУ імя Я. Купалы. А праз некаторы час я на тыдзень паеду на Беласточчыну, дзе буду займацца вывучэньнем тамтэйшых дыялектаў.

— Зараз зьявілася шмат навукоўцаў у Эўропе і ў Амэрыцы, якіх цікавіць Беларусь, мова, літаратура, культура гэтай краіны. Якія сувязі існуюць паміж вамі, ці ёсьць сумесныя праекты?

— У Менску знаходзіцца штаб-кватэра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Да таго ж хутка ў Амэрыцы адбудзецца першы амэрыканскі кангрэс беларусістаў. Пасьля гэтага кангрэсу можна чакаць шмат цікавых прапаноў.

Я тут на Беларусі прапанаваў сваім беларускім калегам распачаць доўгатэрміновае дасьледваньне. У некалькіх вёсках Наваградчыны я запісаў дзяцей, іх сёньняшні стан мовы. Было б цікава год праз пяць прасачыць, якія зьмены адбываюцца ў мове гэтых жа дзяцей. Такія дасьледваньні можна рабіць пэрыядычна, каб паглядзець, як адлюстроўваецца палітыка беларусізацыі на моўных паводзінах людзей.

— Курт, ты меў магчымасьць жыць і размаўляць зь людзьмі, умоўна кажучы, Усходняй Беларусі і Заходняй. Якія, на твой погляд навукоўца, існуюць адметнасьці, асаблівасьці ў мове людзей гэтых рэгіёнаў?

— Традыцыйныя гаворкі Заходняй Беларусі маюць меншы ўплыў расейскай мовы. Але Ўсходняя Беларусь усё ж-такі ведала пэрыяды беларусізацыі. Праўда, у Заходняй Беларусі ёсьць традыцыі незалежнага беларускага школьніцтва, прыкладам якога была беларуская гімназія ў Навагрудку, Таварыства беларускай школы.

Цікава, што моўная сітуацыя на Беларусі вельмі падобна да сітуацыі ў Нарвегіі. Нарвэжцы страцілі сваю незалежнасьць у XIV стагодзьдзі і спачатку пад уплывам Даніі, а потым — Швэцыі нарвэжская мова страціла дзяржаўны статус і ў якасьці дзяржаўнай пачалі ўжываць дацкую мову. А ў мінулым стагоддзі пачалі ўнармоўваць дацка-нарвэжскую «трасянку», якая ўзьнікла ў гарадох. Потым нарвэжскія нацыяналісты вырашылі зрабіць з гэтай «трасянкі» літаратурную нарвэжскую мову, але былі і тыя, якія лічылі, што гэтая новая мова занадта блізкая да дацкай, што яна проста дыялект дацкай мовы. Таму мовазнаўца Івар Оссэн вырашыў стварыць новую літаратурную мову на падставе заходненарвэжскіх гаворак, у якіх захавалася шмат архаічных рысаў. І зараз у Нарвэгіі існуюць дзьве мовы: на захадзе ўжываюць новую мову, якая ня мае дацкіх уплываў, а ў Осла, у гарадох размаўляюць на дацка-нарвэжскай «трасянцы». Так што нарвэжская мова, як і беларуская, яшчэ ствараецца. І ў Нарвегіі зараз лічыцца прэстыжным размаўляць на сваёй роднай гаворцы.

— Сярод мовазнаўцаў, гісторыкаў, культуролагаў Беларусі пачаліся дыскусіі аб беларускім правапісу. Якое ў цябе, як у дасьледчыка, стаўленьне да гэтага пытаньня?

— Я лічу, што напэўна арфаграфія Тарашкевіча лепш адлюстроўвае некаторыя фанэтычныя рысы беларускай мовы, напрыклад, тое ж ужываньне мяккага знака. Увогуле жыхары гарадоў ужо страцілі веданьне мовы, і таму мае вялікі сэнс адрадзіць мову, натуральную для гэтага народа, а не ствараць новую, выдуманую, падстроеную пад расейскую. Вядома, што спачатку адраджэньне мела палітычнае значэньне, і калі пачыналася гаворка пра тую ж мову Тарашкевіча, то лічылася, што людзі, якія яе абаранялі, гэта нацыянал-фашысты.

Усё-такі мне здаецца, што арфаграфія — гэта не самае галоўнае ў моўнай рэформе, больш істотныя пытаньні — лексіка, сінтаксіс. Зараз вельмі важна пашырыць сфэру ўжываньня літаратурнай беларускай мовы, знаходзіць больш практычныя варыянты яе ўжываньня, а не змагацца за нейкую ідэялягічную форму.

— Наколькі такая дзяржава, як Беларусь, існуе ў сьвядомасьці амэрыканцаў?

— У амэрыканскім друку часта можна чытаць пра ўсе былыя рэспублікі Савецкага Саюза.

Беларусь узьнікла як новы кантынэнт, які паўстаў ня толькі перад навукоўцамі, але і перад простымі амэрыканскімі людзьмі. Зараз перасталі ужываць слова «Bielorussia», бо яно гучыць амаль што як «Russia», а пачалі гаварыць і пісаць «Bilourus», і гэта не гучыць як Расея, таму далей гэтай блытаніны ня будзе.

Распавяду цікавы факт. Яшчэ ў траўні мне тэлефанавалі з Дэпартамэнту ЗША зь цікавай просьбай: хацелі, каб я прыняў экзамен па беларускай мове ў кандыдатаў на пасаду выкладчыкаў беларускай мовы ў інстытуце замежных моў. Справа ў тым, што паколькі Беларусь стала незалежнай дзяржавай, амэрыканцы вырашылі падрыхтаваць дыпламатаў для працы ў Менску. Гэтыя спэцыялісты павінны ведаць ня толькі расейскую мову, агульнапрызнаную ў былым СССР, але і дзяржаўную беларускую. Дык вось было чатыры кандыдаты на гэтую пасаду і я іх экзаменаваў. Толькі дзьве жанчыны сапраўды добра валодалі моваю. Астатнія мяркавалі, што амэрыканцы ўсё роўна ня ведаюць, якая існуе розьніца паміж беларускай і расейскай мовамі.

— Твае ўражаньні аб сучасным беларускім мастацтве, літаратуры, музыцы.

— На Беларусі шмат выдатных Майстроў. Я вельмі паважаю паэзію Алеся Разанава, у Менску пазнаёміўся з надзвычай цікавым мастаком і паэтам Хведарам Кашкурэвічам. І яшчэ мне вельмі падабаецца беларускі рок, люблю слухаць «Уліс», «Краму» — гэта сапраўды эўрапэйскі ўзровень.

Наша гаворка працягвалася некалькі гадзін. Курт Вулхайзэр — прыемны субяседнік, разумны і адукаваны чалавек, які ведае дзевяць моваў і не абмяжоўвае сябе ў імкненьні ведаць як мага болей, быць сапраўды грамадзянінам Сусьвету.

«КУР-КУ-ЛІ»

Нядаўна гасьцяваў у мяне сябра Лявон з Ніжняга Ноўгарада. Сябрука вельмі цікавіла наша Гарадзенскае торжышча. Таму й наведаў ён наш цэнтральны — рэчавы рынак. Усё ўбачанае зьдзівіла Лявона, і асабліва асартымэнт харчовых радоў. Я спрабаваў растлумачыць госьцю, што ўсе яблыкі, грушы, сьлівы, вэнджаніна, сала, кілбасы — мясцовай прыватнай вытворчасьці. Але ён ня даў гэтаму веры, сказаўшы: так жывуць толькі ў Амэрыцы ці ў Заходняй Эўропе.

Шчыра прызнаюся, мяне ягоныя словы зьбілі з панталыку. Колькі не спрабабаў растлумачыць яму, што тутэйшыя людзі ўсё вырошчваюць ці на лецішчах, ці на невялічкіх прысядзібных гародах. Пераканаць ніжагародца словамі было складана, і я вырашыў на прыкладах даказаць рэчаіснасьць прыватнага сакрэту Горадні.

Вузкія неасфальтаваныя вулкі вядомага у горадзе раёна Палестына сустрэлі нас сьпевам пеўняў, рохканьнем сьвіньняў, былі двары, дзе гагаталі гусі і нават мычалі каровы. Бадай у кожным двары ўзьведзены цяпліцы, растуць яблыні, вішні. У адзін з такіх двароў мы асьмеліліся зайсьці. Гаспадар Вячаслаў Жук, даведаўшыся, што хочуць нечаканыя госьці, вядзе нас па сваёй гаспадарцы. Участак каля хаты ў Вячаслава Якаўлевіча няпоўных шэсьць сотак, але на іх спадар Жук разам з жонкай збудаваў цяпліцы дзесяць на пятнаццаць мэтраў, у ёй растуць гуркі, салата, цыбуля, часнык. Побач зь цяпліцай хлеўчык, у якім дзьве сьвіньні, далей сад: яблыні, грушы, сьлівы. Усе дрэвы растуць у строгіх шэрагах, паміж іх стаяць вульлі, якіх у гаспадара 25 штук. Распытваю, ці цяжка працаваць, ці хапае часу, ці можна на такім маленькім загончыку зямлі пракарміць сябе і сям'ю, дый гаспадарка немалая: каля хлява яшчэ катух для курэй, ёсьць пуховыя трусы.

— Нават калі б я нідзе не працаваў,— заўважае В. Жук, то змог бы пражыць толькі з гаспадаркі. Галоўнае — ўмець гаспадарыць і не ленавацца працаваць. Я ж працую каля хаты і маю дзяржаўную службу (ён працуе ватраўніком). Мяне яшчэ бацька вучыў як, што і калі садзіць, як апрацаваць, адным словам,вопыт я пераняў ад яго. Што ж тычыцца таго, як я выкручваюся і трымаю вялікую гаспадарку, дык тут трэба кемлівасьць. Вы бачыце: у мяне ўсяго шэсьць сотак і ўсёй жывёле хапае харчу. Я кіруюся традыцыі, якая існуе у нашай акрузе дзясяткі год. У мяне добры сад, ёсьць мёд, гуркі. Усё лішняе я не трымаю, не гнаю, а нясу на рынак. На выручаныя грошы набываю неабходную бульбу, муку, камбікорм, калі трэба, бяру ў калгасах дзялкі буракоў.

Карацей, нічога звышсакрэтнага ў гэтым няма. Трэба толькі не ленавацца, і, галоўнае, не чакаць, што нехта, некалі створыць нейкі камунізм, і ўсіх бясплатна накорміць. Свой «камунізм», а яго разумею як уласны дабрабыт, я стварыў сваімі дзьвюма рукамі пры дапамозе жонкі, дзяцей...

Ужо пасьля вяртаньня да сябе у Ніжні Ноўгарад Лявон прыслаў мне ліст, дзе называў тых, хто працуе, «куркулямі». На жаль, ён дадаў, што такіх людзей трэба душыць, бо менавіта яны не дазволілі Савецкаму народу (чытай: расейскаму) збудаваць агульны калгасна — саўгасны дом, а заўжды цягнулі коўдру на сябе.

Шкада, што у бліжнім замежжы існуюць маладыя людзі такіх вось поглядаў. Упэўнены: дай ім волю, і яны, як некалі камсамольцы «прадразьвёрсткі» зьнішчалі «кулакоў», будуць нішчыць тых, хто нас корміць, а разам зь імі і нас. Ня дай Божа!

Г. АСТРОЎСКІ.

СЬВЯТЫЯ УГОДКІ

Сёлетні год адметны ў гісторыі Беларусі, сьвяточны, блаславёны. У дні, калі ўвесь праваслаўны сьвет адзначае народзіны Прысьвятой Багародзіцы Прыснадзевы Марыі, на нашай зямлі сьвяткуюцца ўгодкі тысячагадовай гісторыі праваслаўнай царквы на Беларусі.

Роўна тысячу год таму, у 992 годзе, сьвяты голас эвангельскай пропаведзі з усёй прыгажосьцю загучаў на старажытнай беларускай зямлі. Жыцьцё нашых продкаў напоўнілася аздобленым словам веры ў Хрыста Выратавальніка. Беларусь, і менавіта Полагчына, зьмяніла паганскую веру на хрысьціянскую.

Тысячагодзьдзе веры шырока сьвяткавалася праваслаўнымі вернікамі на ўсёй тэрыторыі суверэннай Беларусі.

Г. А.



ЧАМУ ЛІДЗКІМ ТАКСІСТАМ НЕ ПАДАБАЮЦЦА КАЎКАЗЦЫ?

У апошні час лідчане ўжо пачалі прывыкаць да злачынстваў, як гэта ні жахліва гучыць. Не праходзіць тыдня, каб не пачуць нечага новага: то ў бойцы кагонебудзь заб'юць, то знойдуць кагосьці, хто загінуў пры невядомых абставінах, то палюбоўнік са сваёй каханкай не паладзілі і высьвятляе адносіны з дапамогай «падручных» сродкаў, то зь дзяўчыны якой бандыты завушніцы зьдзяруць, або яшчэ й згвалцяць. Карацей кажучы, што ні дзень, дык чакаеш чагосьці.

Вось і нядаўна лідчане азнаёміліся з жахлівай аб'явай пад загалоўкам «Адшукваецца забойца», у якой гаворыцца: «12 жніўня ў 19 гадзін 30 хвілін каля вёскі Вялікае Сяло Лідзкага раёна зьдзейснена забойства грамадзяніна Кавунова А. Е., які на аўтамашыне «ВАЗ-21063», дзяржаўны нумар Д 33-62 ГК, белага колеру, займаўся прыватным перавозам.

Устаноўлена, што 12 жніўня ў 18 гадзін 20 хвілін у Лідзе на прыпынку па вул. Савецкай каля магазіна «Камсамольскі» пацярпеўшы ўзяў пасажыра.

Аддзел унутраных спраў зьвяртаецца да грамадзян, якія бачылі, як у машыну сядаў пасажыр, просіць паведаміць у міліцыю.

Узнагароду за інфармацыю гарантуем».

Пра прыватных таксістаў гаварылі заўсёды ня вельмі добра: маўляў, хапугі яны, і дзяруць шмат, але каму трэба было, той карыстаўся. Ва ўсялякім разе, ў тэрміновых выпадках ужо ня трэба стаяць у чарзе па таксоўку. Але, аказваецца, ня кожны пасажыр жадае аплочваць свой праезд.

Як ужо вядома, А. Е. Кавуноў працаваў таксістам у кааператыве «Іскра». Кажуць, у той дзень ён падабраў пасажыраў «каўказкай нацыянальнасьці», якія затым не пажадалі ня толькі расплаціцца за праезд, а нават захацелі завалодаць машынай. Потым, відаць, спалохаўшыся, уцяклі.

Пасьля гібелі таксіста разгарнуліся падзеі, у якіх некаторыя нават абвінавачваюць кіроўцаў аўтамабіляў. За што? За тое, што ўсе члены кааператыва «Іскра» падпісаліся пад зваротам у гарвыканкам аб тым, каб на рынку забаранілі гандляваць асобам каўказкай нацыянальнасьці, затым на наступны дзень, кажуць, таксісты на рынку ўчынілі разгром: білі кавуны й дыні. Праўда, чаму апошняе прыпісваюць таксістам, невядома. Напэўна, таму, што трапіў у трагічную сітуацыю чалавек гэтай прафэсіі. Бо старшыня кааператыва «Іскра» Юрый Паўлавіч Чайко катэгарычна адмаўляе, што да разгрому на рынку прыклалі руку работнікі кааператыву.

— Людзі самі даўно ўжо абураны тым, што ад каўказкай гародніны дзяцей часта баляць жываты. А гэты выпадак проста падліў алею ў агонь.

— Чаму Вы лічыце, што забойца — не славянін? — пытаюся.

— Памыляецеся, мы пакуль што нічога ня лічым, аб гэтым цьвёрда можна будзе сказаць толькі пасьля таго, як злачынцу знойдуць. Але мы ведаем, што ня толькі ў Лідзе бывалі выпадкі грубых адносін да таксістаў з боку каўказцаў. А ў іншых гарадох ужо даўно ўведзены абмежаваньні часу пражываньня каўказцаў у гасьцініцах, гандлю імі на рынку. Бо афіцыйна ўстаноўлена, што большая частка самых жахлівых злачынстваў на іх сумленьні. Так што мы ў сваім звароце не прыдумалі нічога новага.

Толькі ў адказ на зварот таксістаў — цішыня... Відаць, маўчаньне — самая характэрная і найбольш прымяняльная тактыка нашых кіраўнікоў. Ні «так», ні «не» — і адказнасьці ніякай.

Т. КУДРАШОВА,
г. Ліда.

СКАЎЦКАЕ ЛЕТА

Ад 1 да 12 ліпеня на ўтульным беразе Нёмана ўсталяваўся летнік «Пужыцкі Луг». Скаўты Гарадзенскай харугвы прыплылі сюды разам з сябрамі Гомельскай, Менскай, Маладзечанскай харугваў і Парэцкага зьвязу.

«Ойча наш, каторы ёсьць на небе...» — пачынаюць дзень скаўты на ранішнім узьняцьці нацыянальнага сьцяга. «Дай Божа, каб заўтра мы былі лепшымі, чым сёньня,» — словамі скаўцкай малітвы заканчваюць яго.

Кожны дзень — частка праграмы для трох дзесяткаў хлопцаў і дзяўчат, будучых лідэраў Аб'яднаньня Беларускіх Скаўтаў, куды ўваходзіць Гарадзенская харугва. Шмат трэба ўмець і ведаць скаўту. Таму ў летніку ўсё выконваецца сваімі сіламі (паліва, кухня, абслуга, начная варта). Скаўты чысьцілі лес ад бураломў, закопвалі раськіданае кімсьці сьмецьце, выконваючы абавязкова добры ўчынак. Двойчы дапамагалі тушыць пажары.

Распачаўся летнік падрыхтоўкай Купальля. Дружнай працай пасьпелі ў час, і перад самым заходам сонца на купальскім полі запалалі паходні. Шмат для кагось сьвята ў навіну. Большая частка традыцыйных пэрсанажаў сьвята — зь ліку гасьцей, бо ўдзел — найлепшая навука. І шмат для каго з гэтых трыццаці хлопцаў і дзяўчат ачышчальны скок цераз купальскае вогнішча стаў як бы скокам да самога сябе, да свайго нацыянальнага «Я».

Тры асноўныя прынцыпы скаўтства: зь іх першы гучыць «Бог і Бацькаўшчына». Для беларускіх скаўтаў гэта заклік сёньняшняга нацыянальнага Адраджэньня, абуджэньне памяці і сьвядомасьці, спасьціжэньня культурных здабыткаў свайго народа.

Эмацыянальны настрой Купальля добра падмацоўваўся наднёманскімі краявідамі, вечаровымі сьпевамі, гутаркамі маладых гісторыкаў, экскурсіяй у непаўторную Горадню зь цікавым гідам — менскім археолагам Алесем Краўцэвічам. А да гэтага — гасьцінны лес, ягады, купаньне у цяплютэкай нёманскай вадзе, вандроўкі па навакольлю. Таму нядзіўна, калі на пытаньне, што найбольш падабаецца ў летніку, прагучаў адказ малой скаўткі: «Свобода».

Гэтак жа свабодна, з уласнай нявымушанай волі, склалі скаўты сваю прысягу на вернасьць Богу і Бацькаўшчыне, гатоўнасьць дапамагаць бліжнім у кожнай патрэбе. Трэба шмат чаму навучыцца, каб з поўным правам насіць ганаровае імя Скаўта Беларусі. Будзем спадзявацца, што хлопцы і дзяўчаты, пасьвечаныя ў скаўты, заўтра будуць лепшымі, чым сёньня, як запавядае скаўцкая малітва.

Няхай гучыць у іх сэрцах покліч:

— Скаўты Беларусі, напагатове!

— Заўжды!

Ю. ТАРАСЭВІЧ,
камэндант летніка,
сябра Рады АБС.



НАВІНЫ

«І ВАМ БУДЗЕ ДОБРА, І НАМ БУДУЦЬ ЦАЦКІ»

На старонках мастоўскай райгазэты «Зара над Нёманам» надрукаваны допіс дзьвюх школьніц. З асабістых назіраньняў яны зьвярнуліся да дарослых, якія узначальваюць прадпрыемствы і арганізацыі горада аб 'яднацца і збудаваць ў Мастах спецыяльны завод (можа, гучыць непрывычна), на якім вялося б аднаўленьне цацак. Тым больш, калі выкідваюцца лялькі бяз рук, бяз ног, нават бяз галавы. А чаму не пакінуць яе, як і іншыя рэчы, да пары, да часу, а потым здаць для перапрацоўкі.

Магчыма, нашы дзеці бачылі б значна менш бездухоўнасьці, жорсткасьці.

Слова за прадпрыймальнікамі.

І. ПЯТРОЎ.

СОНЕЧНЫ КАМЕНЬ У БЕЛАРУСІ

Тры з паловай кілаграмы адборнага бурштыну было знойдзена менскімі археёлагамі пры раскопках сярэднявяковага жытла ў горадзе Клецку — цэнтры старажытнага Тураўскага княства. Скарб унікальны, а таму цікавасьць да яго вялікая. Як трапіў бурштын да сярэднявяковага залатара? Ці існаваў гандаль з балтамі ў тыя далёкія часы? На гэтыя і многія іншыя пытаньні бяруцца адказаць берасьцейскія дасьледчыкі бурштыну пад кіраўніцтвам прафэсара пэдагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна Альбэрта Аляксандравіча Багдасарава.

Праводзячы комплекс мінэралягічных і хімічных дасьледаваньняў, нашы вучоныя прыйшлі да высновы, што старажытныя злотнікі зьбіралі бурштын у мейсцах свайго знаходжаньня, так як бурштын з археялягічных раскопак па ўсіх парамэтрах адпаведны якасьцям з рачных і балотна-азёрных утварэньняў антрапагенавага ўзросту.

А менавіта да адлажэньняў гэтага ўзросту адносяцца шматлікія знаходкі «сонечнага каменя» у паўднёва-заходніх частках нашае рэспублікі. Не выключэньне, што скарб, але ўжо геалягічны, будзе адкрыты ў мейсцах стаянак старажытных людзей.

АДКРЫТЫ РЭЧАВЫ КІРМАШ

Рэчавы кірмаш, аб якім так доўга гаварылі ў Берасьці, адкрыты ў верасьні. Усё адбывалася даволі звычайна і будзённа, дарэчы, як і ўсе вялікія падзеі гісторыі.

У першы рычачны дзень на кірмашы пабывала 150 гандляроў і 2.267 пакупнікоў. Для тых, хто зьбіраецца ашчасьлівіць кірмаш сваім наведваньнем, трэба ведаць, што толькі ўваходны білет каштуе 10 рублёў, за гандаль на крытым прылаўку прадавец з Беларусі плаціць 50 рублёў, а іншых краін — 200, за гандаль на адкрытым стале — 30 і 150 рублёў адпаведна, і за гандаль з машыны — 150 і 400 рублёў.

Агульная сума ад прадастаўляемых паслуг за дзень — 30 тысяч рублёў, што для кірмашу, як паведамілі ў бухгалтэрыі рынку, будзе малавата, трэба хаця б тысяч сто.

А пакуль — з пачынам. Стаскаваўшыся па рыначнай эканоміцы, абывацель атрымаў хоць нейкую яго падобнасьць.

Вопыт варты пераймання.

П. ЖЭБРАК,
кар. «Пагоні» па матэр'ялах газэт «Вечерний Брест» і «Брестский курьер». (2.10.1992 г.).

ЗАМЕСТ РЭЦЭНЗІІ

Зянон Пазьняк пра Максіма Багдановіча

Тыднёвік «ЛіМ» надрукаваў вялікі, на цэлы разварот, артыкул Зянона Пазьняка пра паездку ў Ялту на магілу Максіма Багдановіча. Кагосьці, можа, зьдзівіла, што Зянон Станіслававіч увесь такі дзеяч, такі надзьмуты ды пануры, а на самай справе ён жа й вершы піша. Але тут нічога дзіўнага. Калі чалавек жыве абсалютна нелягічна, то хутчэй за ўсё ён паэт па характару. А піша ён там што ці ня піша — гэта ўжо яго справа.

Дарэчы, ўмантаваныя ў апавядальны лад пазьнякоўскага эсэ стылізаваныя танкі ці хоку напісаныя вельмі прыстойна, узровень і тэхніка нармалёвая. Але, паўтаруся, гэта не галоўнае.

Колькі ўжо езьдзілі да тае Ялты й тае магілы! Колькі апавядалі знаёмым! Колькі пісалі ў друку! І ўсё па-ранейшаму — зь нейкімі дзіўнымі ідэямі... А давайце вакол чырвонай зорачкі на помніку родныя паэту блакітненькія васілёчкі падмалюем... А давайце возьмемся, раскапаем магілку ды перанясем паэтавыя костачкі, калі яны яшчэ не згнілі, на родненькую Беларусь... Першае ўжо зрабілі, другое — дзякуй Богу, яшчэ не пасьпелі. Але кожны, ад няздараў да наіўнякоў сьвятых, апавядаў гэтаксама пра дзьве рэчы: першае, што помніка зусім ня відаць, бо нешта яго закрывае, па-другое, што нідзе няма ніякіх шыльдачак, а тамтэйшыя абарыгэны таксама нічога ня ведаюць. І як гэта ўсё дрэнна...

Зь літаратуры «нашаялцінскай пары» запомніў я толькі апавяданьне Уладзіміра Арлова «Старыя кальварыйскія могілкі», напісанае з тактам і палюдзку. Але й Валодзя абурыўся на брак шыльдачак ды неўпарадкаванасьць апошняга прытулку. Скончыў жа ён толькі тым, што на лісьце наконт «пераносу», зь якім у Менску да Валодзі зьвярнулася нейкае «нацыянальнае заклапочанае дзяўчо», ён мудра прыпісаў: «калі Беларусь будзе беларускай...». Добра, што не сувэрэннай. Вось яна ўжо сувэрэнная, аж занадта... А толку з гэтага — кот наплакаў.

Канец жа пазьнякоўскага эсэ канкрэтны і ясны. Першае — пераносіць нікога нікуды ня трэба, таму што дзе хрысьціянін пахаваны, там і павінен ляжаць, дый колькі Максім быў на той Беларусі! Другое. Праблема зь нябачным помнікам вырашаецца тым, што на магіле трэба паставіць белы крыж вышынёй шэсьць мэтраў, які будзе дамінаваць над запушчанай зялянінай могілак, але не разбурыць яе, таму што белы добра спалучаецца зь зялёным. Трэйцяе. Да магілы ад цэнтра Ялты трэба дабірацца так і так. Такім вось нумарам транспарту, там вылезьці, па такіх прыступках падняццаспусьціцца, міма такой ЛЭП ісьці, каля такой вечнай жалезнай бочкі павярнуць. Паны-адраджэнцы, прашу да Ялты...

М-да, гэта кляс... Можа, ён і кадры ня тыя падбірае, гэты Пазьняк, можа, цісьне ці занадта, ці замоцна, можа, часам і робіць памылкі, бо жывы ж чалавек, але пароду відаць. Гэты ведае, чаго хоча.

Увогуле, гэта была прадмова. А ўся рэцэнзія будзе з аднае фразы: **прыйшоў гаспадар і сказаў, што рабіць.** Адным словам, навёў парадак. І хоць у гэтым краі парадку ня было ніколі, дай яму, Божа, каб хоць троху ў яго, але атрымалася.

А. ЗЕЛЯНКОЎСКІ.

ЭСЭ

ҚРЭСАВЯК

(Заканчэньне. Пачатак у № 8).

Каб зэканоміць час, прывяду адразу вытрымку зь ліста Ю. Мацкевіча да З. Сямашкі, надрукаванага ў варшаўскай «Вензі» — адразу будзе ясна, пра што гэта кніга, хто і за што душыў яе і яе аўтара. Пра што «ня трэба гаварыць у голас»...

«... я не прысьвяціў гэтую кнігу польскаму падпольлю. Але і абмінуць яго ня мог. Қалі гаварыць пра віленскае падпольле, то я стаўлюся да яго сапраўды іначай, чым казённыя прапагандысты й каналізатары. Пра тое, што мясцовыя атрады АҚ былі ўзброеныя самімі немцамі, ведаў кожны паляк — але «не тшэба мувіць глосьне!»,— ведаў кожны беларус і летувіс — гэтыя гаварылі й гавораць! — гэта такая ж абсалютная праўда, як тое, што цяпер гэта абсалютна *замоўчваецца! Тут дык мы салідарныя... Сягоньня ўвогуле цяжка гаварыць пра нейкую праўду, калі тая праўда час ад часу таму ці другому аказваецца не даспадобы. Я гляджу на гэта, як на нейкую схэму, на сутнасьць часу... Гэта ж абсурд, калі немцы ўзбройваюць палякаў і летувісаў, каб тыя душылі савецкую партызанку, а тыя душаць адны другіх! Але аб ´ектыўных гісторыкаў усё менш, а тыя, хто ёсьць, паміраюць усё часьцей. Праўдай лічаць тое, што хочуць бачыць...*

Ці ня горшая за польскую сітуацыя зь летувіскім ды беларускім бокам. Справа тут вось у чым. Қаб пра нешта «сьведчыць», трэба акрэсьліць, а дзе ж ты, сьведка, быў тады сам? Альбо: прызнаць сваю адкрытую ці патаемную, але супольную работу з акупантам. А паколькі цяпер ліст напісаны ў 1970 годзе — аўт. супрацоўніцтва зь немцамі лічыцца Абсалютным Злом, то погляды пераварочваюцца на супрацьлеглыя. Даходзіць да таго, што газэта беларускіх эмігрантаў, якія ў свой час скалачвалі Беларускую Краёвую Абарону й паліцыю для барацьбы з партызанамі, пахваляецца тым, што іх Беларусь... была самай партызанцкай рэспублікай! Тое ж датычыць і маіх добрых знаёмых, летувісаў і беларусаў, якія ня хочуць мяне бачыць, таму што ня сьмеюць ілгаць мне проста ў вочы. Аказваецца, дарэчы, што шаўлісы не забілі ў Вільні ніводнага яўрэя, а змагаліся зь немцамі за незалежнасьць Летувы... Тое ж датычыцца расейцаў. Іх тэарэтык з НТС Қазанцаў напісаў, што «уласаўцы», аказваецца, не біліся на нямецкім баку пад Кіевам і на Одэры, не душылі Варшаўскае паўстаньне, не ахоўвалі канцлягеры, не стралялі партызанаў і не палілі вёскі! Яны, аказваецца, толькі змагаліся зь немцамі за незалежнасьць Расеі... Таму вось і злуюць на маю кніжку і палякі, і беларусы, і расейцы, і летувісы...».

Забойчы ліст.

IX.

Прайшло дваццаць два гады. А паколькі цяпер, як напісаў бы Ю. Мацкевіч, сітуацыя мяняецца на супрацьлеглую, то супрацоўніцтва з Саветамі лічыцца абсалютным злом, і адпаведна таму мяняюцца погляды, перапісваюцца ўспаміны, паўстае новая «праўда»...

Спадар Қ. Акула з Қанады ўсё жыцьцё пакутаваў, што бальшавіцкая прэса яму «нафашысьціла», абліла брудам... Так то так, але вось чытаю яго ўспаміны ў «Зважай». І што? А зноў тое самае! Маршыруюць беларускія хлопцы з БКА ў нямецкай форме праз польскую вёску, адзін пытае: — Матка, гдзе ту воды се напіць? — Там, сынку... А там у бочцы не вада, а смала! Ах, гадкія, абураецца аўтар, ах, гадкія шавіністы, як ненавідзяць яны нас, беларусаў...

Ненавідзяць, можа, і ненавідзяць, але як адказваць хлопцу ў нямецкім мундзіры, які пытаецца па-польску і ў якога на ілбе нічога не напісана пра яго нацыянальнасьць? ! І потым — мала там, што і калі з кім было, але калі ўсё жыцьцё абураешся, што табе дарэмна «фашысьцяць», то навошта самому пісаць тыя ж, па сутнасьці, успаміны?! Дзе логіка? — як абураецца адзін зь цяперашніх парляментарыяў...

То ўсе пагалоўна АҚ-оўцы былі раней «здраднікамі» ды «фашыстамі». То цяпер усе пагалоўна раптам зрабіліся «гэроямі»: па-за немцамі яны, адказваецца, мухі не пакрыўдзілі.. . Ах , ах, высокі кляс... Аказваецца, не атрад АҚ прыйшоў летам 1940 году ў Скідаль, выразаў прысланы райком, а заадно пабраў у «тутэйшых» добрыя лупы, прыхапіў з сабой дзесяць смаркачоў для парадку, каб пана не забывалі — і шлёпнуў іх на Қотры. Аказваецца, гэта не майго роднага дзядзьку Анатоля Зелянкоўскага пад абрыў ставілі, не яму куля паміж галавой і кепкай прайшла, не ён ад страху прытомнасьць згубіў, не ён ноччу дахаты прыпоўз і тыдзень у гарачцы ляжаў. Ня можна, «не позволяму»... А можна яму толькі ў 1942-м у нямецкай пятлі павіснуць — то ж немцы, акупанты! І то, як так пойдзе далей, то яшчэ невядома: дзядзька ж не ў СМБ быў, а ў камсамоле, не за немцаў ваяваў, а супраць іх...

Але дзе там! Қалі пан Мацкевіч, «велькі пісаж», у пані Варшавы цяпер як «здрайца» праходзіць, то куды ўжо мне, правінцыялу цёмнаму, хаму крэсоваму, месца сваё хамскае забыўшаму... Так і жывем.

IX.

Паміж XIX і XX стагодзьдзямі стары сьвет на гэтай зямлі зьнік і паўстаў новы. Ідыліі тыпа аднасінаў полькі Ажэшкі зь беларусам Багушэвічам альбо лёсу сямейкі Іваноўскіх скончыліся. Няма ні той Польшчы, ні тых палякаў. Мілаш-менш напіша нешта людзкае ды путнае пра гэта крэсовае жыцьцё толькі ў парыскай «Қультуры». У Варшаву, Вільню ды Менск шлях яму заказаны. І ўспрымаецца ён, як выкапень. Ужо ў падсьвядомасьці нейкае зьдзіўленьне: паляк, а які разумны...

А ён проста з другога сьвету. Са сьвету, якога болей няма, пра які дарэмна марыць, які небясьпечна блытаць зь сягоньняшнім днём.

А. ЧОБАТ.
Верасень, 1992.

ЛІТАРАТУРНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ

А. САКОВІЧ

У НЯВЕДАМ'Е

(Працяг. Пачатак у № 7—8)

11

Уначы цяжкім гулам загулі самалёты. Цяжка накладаваныя, яны кудысь ляцелі. Здавалася, што як піць, збамбуюць места Н. Ванда не адважылася застацца ў хаце: яна паслала сабе й дачцы пад дрэвамі. Прыйшлі ў сад і ейныя суседзі — стары доктар із жонкаю.

Ноч была такая цёплая, што Ванда засталася ў лёгкай летняй сукенцы, нават не накінуўшы хусткі, што ляжала побач яе на разасланай на траве коўдры. Яна сядзела, абапершыся аб камель старое рассахатае яблыні. Паклаўшы галоўку на ейныя калены, заснула малая Аленка — Ялінка, як звалі яе ўсе.

Дарослыя ня спалі: ціха гутарылі, напружана прыслухоўваліся. Зацемненае места было поўнае незвычайнымі гукамі. Палахліва й таямніча ўспрыймалася ўсё навокал. Адусюль чуліся шолахі, далёкія выбухі бомбаў, грукат артылерыі. Вайна. Страшным і пагрозьлівым здавалася ўсё, нат свой родны зарослы сад.

— Мы ўчора ля Слонімскае вуліцы партызана бачылі, — гаварыла Ванда. — Стуль блізу ўсе выехаўшы. Мы зь Ялінкаю йдзём, а на нас — якісь п'яны. Мы хацелі перайсьці на другі бок вуліцы, а ён як гыркне: «Стой! Ато страляць буду». Мы сталі. Ён падыйшоў бліжэй і кажа мне: «Убегаеш, паразітка, парцізана баішся?» — і наверх гадка вылаяўся.

— Эмблемы надыходзячага савецкага дабрабыту й культуры, — з прыціскам гіроніі ў голасе перабіў доктар.

— Даяцё веры? Тае часіны я гэта самае падумала. Ён вылаяўся й пайшоў. А я стаю, хачу йсьці — ногі ня служаць. Ялінка зьбялеўшы, ручка ў маёй руцэ дрыжыць. Думаю: о, Божа, памажы нам ад іх уцячы. Але разам з тым рушыць у няведам ´е, аднэй зь дзіцём... Аднэй... — голас у яе задрыжэў, яна змоўкла.

— А ваш брат? Яго апошнімі днямі штось зусім ня відаць. Дзе ён дзяецца?

— Казік ня едзе. Ён у тэй групе батальёнцаў, што тут у падзямельлі застаюцца. Дый Тамара ня едзе, гэта яго таксама, думаю, вяжа. Нічога ня зробіш, першае каханьне, а яно, здаецца, заўсёды наймацнейшае. Надоечы ж камандзер батальёну пасылаў яго ў Ліду для сувязі. Толькі сяньня пад вечар вярнуўся, дадому на часінку заскочыў. Казаў, каб я зь Ялінкай заўтра ўвечары была гатова выехаць, Сяргей Малаха дае каня й воз.

— Дык гэта ваша апошняя ноч дома?

— Выходзіць, што так. Апошняя й вельмі цяжкая. Нялёгка пакінуць родны дом, магілы бацькоў, аднаго Казіка... Мо й Міхась якім цудам вернецца, ды ўжо ня знойдзе нас зь Ялінкаю.

— А можа выйсьці йначай, — ласкава азвалася доктарава жонка. — Вунь, кажуць, што шмат хто з нашых, на Сібір вывезеных, у польскае войска трапілі. Недзе цяпер зь немцамі б ´юцца. Узімку Кунцэвічы з Агельшчыны праз Чырвоны Крыж ад сына ліст мелі. Мо й ваш ужо ня ў Сібіры. Яшчэ можаце спаткацца.

— Аб Кунцэвічу я чула, але не даю веры, што й нам такое шчасьце выпадзе. Апошнімі гадамі я развучылася верыць і думаць пра лепшае. Здаецца, чакае цябе яшчэ горшае.

— Што праўда, то праўда, — сказаў доктар. — Даліся нам у знакі апошнія гады. Бр... як жа ня хочацца апынуцца йзноў у краі пабудаванага сацыялізму. У шчасьлівым краі, дзе ўсё такое дасканалае. Дарэчы, Ванда, вы ўчора аднаго дасканалага на Слонімскай бачылі... — І Ванда, і доктарава жонка ціха засьмяяліся.

— Вось мы сьмяёмся, — сказала Ванда, — але трагэдыя ў тым, што доля наша будзе залежыць якраз ад іх.

— Ад іх і такіх палітычных прастытутак, як наш Ковель. Вунь ужо сяньня мая жонка яго ля нашае вуліцы спаткала.

— Ковеля? — зьдзівілася Ванда.

— Яго, Вандачка. Ён бадай не зьмяніўся, хіба ў плячох пашырэўшы. Але не прывітаўся. Мо не пазнаў, а мо не жадаў пазнаць. Толькі што мяне зьдзівіла, быў ён у нямецкай форме зь бел-чырвона-белай адзнакай нашага батальёну.

— Чаму ж гэта Ковель у Н., калі ў месьце яшчэ немцаў поўна. Каму-каму, а яму небясьпечна, — дзівілася Ванда.

— Авантурысты, зь небясьпекаю забаўляецца, — адказаў доктар.

Доктарыха была добрая жанчына. Ёй прыкра было, калі аб кім брыдка гаварылі, пагатоў аб Ковелю, што некалі тут жыў у падсуседзях дый вырас на іхніх вачох.

— Вось ты ўжо залішне на яго: людзі зь Вялікае Слабады кажуць, што ён і не такі ўжо нягодны ды ці раз і зь бяды выбаўляў. А хіба мала нашых людзей мусяць з бальшавікамі, з партызанамі гэтым часам разам быць?

— Э, гэта вялікая розьніца. Часам людзі вымушаныя быць, а ён сам у гэты бруд палез.

— Палез і мо сам ня рады, хто яго ведае. Фантастык ён заўсёды быў, гэта яго й губіць. Памятаю, як яму было год 14, пажартавала я, што ён да беларуса не падобны: валасы чорныя, вочы цёмныя, сам смуглявы, а ён мне расказаў, што ў іхнім родзе з матчынага боку ёсьць італьянская кроў. Быццам прадзед ягоны італьянцам быў і з французкім войскам праз Бярозу адыходзіў, цяжка захварэў і ў Беларусі застаўся, пабраўшыся зь дзяўчынай, што яго адратавала. Так хораша расказваў, што я дала веры. Потым матка ягоная даведалася аб гэтай гісторыі, пасьмяялася: «Вы майго Севу паслухайце, — казала, — ён і гішпанскую кроў у нашым родзе знойдзе».

— Ведаеш , даражэнькая, калі дзіця фантазуе — гэта забаўка, але калі чалавек і ў трыццаць год свае фантазіі не цураецца — гэта ўжо шкодна.

Ванда сядзела моўчкі й не далучалася да спрэчкі. Яна заглыбілася ў свае ўспаміны. Было гэта год 10 уперад. Зыркі маразяны дзень. Яна з Ковелем на іртах у лесе. Зашаранелы казачны лес. Ванда ведала, што праз усё жыцьцё яна не забудзецца на ягоны твар, блізка сьхілены да ейнага, на ягоныя вясёлыя карыя вочы з пабялелымі ад марозу брывамі й вейкамі, на ягоныя халодныя вусны на сваіх. І тады быў пах хвоі, сьцюдзёнае празрыстае паветра, бліскучы сьляпісты сьнег, зыркае сонца й гэтае зьзяньне радасьці ў грудзёх першага пацалунку. А потым за колькі месяцаў Ковель пайшоў да Саветаў. Былі аб ім розныя чуткі: партыйны, рэдагуе газэту, але ніхто пэўнага нічога ня ведаў. І толькі два гады таму зьявіўся Ковель зноў блізка Н. на чале партызанскага аддзелу. «Авантурысты», — з болем думала яна.

— Што гэта вы, Ванда, змоўклі? Сьпіцё? — папыталася дактарыха.

— Не, я думала аб тым, што мне няможна ў Н. заставацца, — адказала першае, што прыйшло на думку, Ванда.

— І думаць ня трэба, а як мага барждзэй, пакуль ня позна, трэба ратавацца, бо грахоў, паводле бальшавіцкае этыкі, шмат маеце. Настаўніца ў часе нямецкае акупацыі, жонка высланага на Сібір інжынера, колішняя студэнтка ў Гэйдэльбэргу — досыць, каб абвясьціць нямецкай шпіёнкай...

— А нам, думаеш, даруюць, што за немцамі ў месьце ў шпіталі застаўся? — перапыніла яго жонка.

— Ну, даражэнькая, я ўжо застары ў лес ісьці. Нат застары, каб цяпер разам зь людзьмі ад іх уцячы. Можа заб ´юць, можа павесяць. Усяго можна спадзявацца. Не такі страх. Ужо стары. Жыцьцё пражыта сумленна.

Доктар змоўк. Маўчала й Ванда. Апошнія трывожныя дні, бяссонныя ночы даліся ў знакі: не хацелася гаварыць. Яна зморана зачыніла вочы. Прачнулася, калі хтось паціху трос за плячо. Адчыніла вочы й спалохана зноў зачыніла: у сьвятле месячнай ночы бачыла блізка сьхілены над ёю твар Ковеля. «Мо гэта толькі сон?» — падумала Ванда, але раптам ізноў адчула, як ягоная моцная рука сьціснула плячо.

— Ванда! — шаптаў ён. — Прачніся. Толькі не разбудзі старых: яны не павінны мяне тут бачыць.

— Чаго табе трэба? — таксама шэпталася яна, глянуўшы на яго суровымі сьцюдзёнымі вачыма.

— Пільная справа, — ціха адказаў ён. — Пайшлі ў хату, там даведаешся.

— Я не магу пакінуць тут дачку.

(Працяг будзе).

МОСТ МІРУ ШРЫ ЧЫНМОЯ

Аўтапераход беларуска-польскае мяжы «Варшаўскі мост» ад гэтага часу стаў называцца Міжнародным мастом міру Шры Чынмоя.

Каардынатар міжнародных сувязей Камітэта Міру Шры Чынмоя Нікунья Эбнер, якая прыбыла на ўрачыстасьць, паведаміла, што гэты «Мост міру Шры Чынмоя» — адзін з 500 помнікаў міру на планеце Зямля, сутнасьць іх — натхняць кожнага члена чалавечай сям´і на захаваньне міру і згоды ў паўсядзённым жыцьці».

Высьветлілася і наступная дэталь: Шры Чынмой, гэты вялікі міратворац з Індыі, сустракаўся з лідэрамі шматлікіх дзяржаў, у тым ліку — гэта было 29 мая 1990 года — з былым прэзідэнтам былога СССР Міхаілам Гарбачовым. Да Беларусі ён не даехаў, не было яго і на Варшаўскім мосьце.

Гонар і пашана індыйскаму міратворцу. Але ж няўжо ў беларусаў няма дастойных імёнаў? Хаця, як сказалі пагранічнікі, мост гэты для іх Варшаўскім так і застанецца, ня стане менш і праблем на мытні.



ПОЛЬСКІ ПЛЯН

Своеасаблівы плян адбудовы Барысаглебскай царквы ў Горадні прапанавалі польскія рэстаўратары. Яны радзяць зруйнаваць храм да падмурка, а затым узьвесьці яго наноў.

Цікава, як паны зьбіраюцца захаваць царкву вернікам у першасным выглядзе? Бо сьцены яе маюць свой будаўнічы сакрэт. Так, звычайныя каменьні, якія на першы погляд абыякава ўмураваны ва ўнутраны інтэр´ер, на самой справе выконваюць вельмі істотную ролю. Страдаўнія майстры пры ўзьвядзеньні царквы адмыслова зпраэктавалі купал. Промні сонца, праходзячы праз яго, так пераломваліся, што іх сьвятло трапляла на кожны камень, ствараючы ў прысутных утульную, спакойную аўру...

А. Г.

КВАТЭРЫ — ВАЙСКОЎЦАМ

Узьвядзеньне жылога мікрараёна для сем´яў ваеннаслужачых хутка пачнецца ў ваколіцах гарпасёлка Рось Ваўкавыскага раёна. Праўда, весьці яго будзе не турэцкая фірма «ЭНКА», а гарадзенскія будаўнікі сумесна са спэцыялістамі з Германіі.

У пастаяннае карыстаньне Слонімскай КЭЧ пад будаўнічыя работы райвыканкам выдзяліў 30 гэктараў зямлі. 27,5 гэктара яе да гэтага былі ва ўладаньні калгаса «Савецкая Беларусь». Каля васьмі гэктараў сельгасугоддзяў названай гаспадаркі забіраюцца часова, на два гады. На іх плануецца размясьціць будаўнічую базу.

Пётр ЖЭБРАК.

З КРЫМІНАЛЬНАЙ ХРОНІКІ

1.

По традыцыі студэнты Гарадзенскага дзяржаўнага унівэрсітэта пачынаюць навучальны год на палетках Астравецкага раёна. Аднак заробак на бульбе па сёньняшніх часах, відаць, не зусім запаўняе пустыя студэнцкія кішэні. Два чацьвертакурсьнікі П. Маркоўскі і А. Карпейчык вырашылі кампэнсаваць свае матэрыяльныя цяжкасьці: сярод белага дня на аўтавакзале ў мястэчку Астравец яны адабралі ў васьмікласьніка тутэйшай школы дыплямат з асабістымі рэчамі.

Цяжка ўявіць, што зараз носяць школьнікі ў сваіх вучнёўскіх торбах, але каб затрымаць студэнтаў, маёру міліцыі Жукоўскаму давялося зрабіць тры стрэлы ў паветра.

2.

Бум з каляровымі мэталамі, здаецца, ня мае ніякіх межаў.

Уначы з 30 верасьня на 1 кастрычніка невядомыя скралі медны звон вагой каля 160 кг з званарні Сьвята-Уладзімерскай царквы ў Горадні.

3.

Якая, скажыце, жанчына ня марыць вяртацца пасьля цудоўнай вечарыны ў рэстаране разам з мужным, адважным, адзіным назаўсёды мужчынам.

Але што тыя мары... У Ленінскі РАУС Горадні зьвярнулася нідзе не працуючая А. Р. Зелянкевіч з заявай, што каля 23 гадзін побач з домам № 3 па вуліцы Курчатава яе пабіў незнаёмы хлопец, які і праводзіў яе з рэстарана «Радуга». Ды і пабіў так, што яна страціла прытомнасьць. А раніцай агледзела, што з рукі згінулі пяць залатых пярсцёнкаў.

4.

У нецьвярозым стане з нажавым раненьнем у жываце прывезла хуткая дапамога нейкага В. Багданава ў чацьвёртую гарбальніцу. На якія-небудзь пытаньні хлопец адказваць адмовіўся, а дачакаўшыся зручнага моманту, з бальніцы ўцёк.

5.

А сёмай гадзіне вечара разагнаў свой «Палянэз» грамадзянін Рэспублікі Польша Вальдэмар Сініцкі ў Горадні па вуліцы Вясеньняй, але не спадзяваўся, што дарога можа рэзка паварочваць. Якраз на самым закругленьні Вальдэмар не справіўся зь кіраваньнем, выехаў на кветнік і «Палянэз» перакуліўся.

Кіроўца знаходзіцца ў шпіталі.

6.

30 верасьня супрацоўнікамі міліцыі ў Горадні затрыманы дзьве аўтамашыны зь Летувы, багажнікі і салёны якіх былі перапоўнены каляровымі мэталамі.

У час разбору ў службовым габінэце Ленінскага РАУС адзін з летувісаў, жыхар Коўні, даў хабар у 50 даляраў ЗША опэрупаўнаважанаму ОБЭП Ленінскага РАУС, лейтэнанту міліцыі, які на службе ў ворганах МУС з 1987 г., а на займаемай пасадзе з жніўня 1991 г.

7.

Надакучыла В. Гладкаму з Карэліцкага раёна і В. Якімовічу са Шчучыншчыны лячыцца ад алкаголю у ЛТП-5 г. Наваградка. Да таго ж і лячэньне ў такіх установах, як правіла, прымусовае. Відаць, адчулі хлопцы, што дні стаяць пагодныя, а на вёсцы такі час, як кажуць: дзень год корміць. Прыкінулі, што да чаго, ды і ўцяклі бульбу капаць, праўда, нікога аб гэтым не папярэдзілі. Давялося шукаць іх міліцыі.

8.

Цёмным вечарам а 19 гадзіне каля дома № 5 па вуліцы Камарова у Горадні супрацоўнікамі міліцыі была затрымана майстар машыннага аддзяленьня мясакамбіната Е. Н. Якубоўская. Зь мясакамбіната спэцыялістка па машынах вынесла 13,6 кг балыка коштам 4420 рублёў.

А кажуць, балыкі ў крамах не прадаюць, бо на мясакамбінаце нібы не хапае нейкага абсталяваньня для іх вырабу.

М. М.

ЛЮДЗКІЯ СУСТРЭЧЫ

ПАН ЛЕШАК

У перапоўненай зале гарадзенскай мытні людзі праседзелі амаль тры гадзіны. Была ноч, хацелася спаць, піць, а тут і нагі не павернеш. Нарэшце, пагранічнікі адчынілі дзьверы і папярэдзілі, што чакаць яшчэ давядзецца на вуліцы, пакуль падрыхтуюць цягнік. Мы ехалі ў Польшчу.

Побач за мной на пэроне апынуўся сталы чалавек. У адной руцэ ён трымаў торбу і ўвесь час спрабаваў тлумачыць нешта мажнай жанчыне, якая важна трымалася каля вялікіх кайстраў і ня вельмі зьвяртала ўвагу на старога. Казаў ён ня гучна, але я разабраў, што гэта па-беларуску з польскім акцэнтам. Раптам яму стала дрэнна. Я прапанаваў сваю дапамогу і запытаў у людзей якога парашка...

Калі ён нарэшце ўмясьціўся на чужую кайстру і павольна ўздыхнуў, я пацікавіўся, навошта яму такія пакуты — як бадзяцца па цягніках, тым больш у нашай краіне. Ён павесялеў і паказаў мне сваю пустую торбу, пры гэтым іранічна дадаў сваім сіплым голасам: — «Няўжо я падобны да гандляра?»

Пан Лешак у свае семдзесят гадоў рэдактар новай газэты ў Беластоку, якая, дарэчы, цалкам прысьвечана эканамічным стасункам Польшчы з нашай рэспублікай.

Усё сьвядомае жыцьцё прайшло ў журналістыцы. Ваяваў, пры камуністых за свае погляды сядзеў за кратамі, ад пачатку «Салідарнасьці» — у яе шэрагах. За доўгія складаныя гады жыцьця страчана здароўе, зьнешне выглядае зусім квола, але ўнутраныя сілы ўсё ж ёсьць. Так, ён не падобны да людзей, якія ў гэтую ноч былі побач з намі.

Пан Лешак узрадаваўся, што сустрэў калегу, просіць называць яго проста Лешак, бо так прынята ў нашым асяродку, нягледзячы на ўзрост.

Мне няёмка перад старым чалавекам, што мы сядзім тут пад адкрытым небам, што побач ходзяць пагранічнікі і даглядаюць нас, як які-небудзь статак, што паўсюдна пра нейкае глупства балбочуць людзі, абставіўшыся вялізнымі кайстрамі.

Ён тлумачыць мне, што на Беларусь ён прыехаў наладжваць неабходныя для працы сувязі, ды і недзе з-пад Клецка яго маці, і ён добра памятае мясьціны, ведае беларусаў і хоча, каб гэта краіна хутчэй адрадзілася.

Пагранічнікі даюць дазвол ісьці да цягніка. Божа, што робіцца... Ляцяць адзін праз аднаго, чапляюцца сваімі вялікімі кайстрамі, падаюць, крычаць... Сапраўды, усё гэта нагадвае статак.

Я трымаю пана Лешака пад руку і нясу дзьве маленькія торбы — яго і сваю. Мы абыходзім людзей з боку.

ГАМЛЕТ

Мне добра сьпіцца ў цягніку, а да Масквы толькі адна раз праваднiца — добрая цётка, не сварыцца, просіць мяне, потым прынесла гарбаткі.

Я ўстаю, але бачу, што зьверху яшчэ нехта ляжыць. Падсеў уначы. Мой сусед па купэ грузін, ён едзе зь Менску. Даведаўшыся, што я не з Масквы, дастае пляшку гарэлкі і кажа, што будзем піць за маю краіну. Я адмаўляюся, а ён настойвае.

На Беларусі Гамлет, так завуць суседа, упершыню. Распавядае, што яму тут вельмі спадабалася, асабліва людзі. Калі ён ехаў сюды машынай праз Расею і Украіну, паўсюдна яго спынялі міліцыянты або рэкэціры: і тыя і другія вымагалі грошы. І толькі на Беларусі пачуў сябе чалавекам, нават машыну запраўляў за дзяржаўны кошт. Шкадуе, што ніколі ня быў тут раней...

У Грузіі зараз вайна, людзі забіваюць адзін аднаго, а ў Гамлета вялікая сям´я. Ён накупляў сваім дзецям у нас на Беларусі адзеньня, падарункаў жонцы і бацькам і яшчэ мае цэлы хобсьць грошай, якім абвязваецца каля паясьніцы.

Я пытаюся, калі скончыцца гэтая вайна ў Грузіі. Але ён не жадае нават пра гэта ўзгадваць, адно ўпэўнены ў тым, што калі ніхто ня будзе да іх умешвацца, дык хутка яна і скончыцца.

Мы ўсё ж выпілі па пяцьдзесят грамаў, пасьнедалі, а праз паўгадзіны разьвіталіся ў Маскве на Беларускім вакзале.

Г. Т.

Заснавальнік: культурна-асветніцкі фонд «Бацькаўшчына».

Наша газэта ёсьць БЕЛАРУСКАЙ ТРЫБУНАЙ, адкрытай для выказваньня розных пунктаў гледжаньня, розных аўтараў зь любых краін, гарадоў і вёсак. Меркаваньні аўтараў публікацый не заўсёды могуць супадаць зь меркаваньнем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі: 230023, г. Горадня, вул. Дамініканская, 1.
Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.

Рэдактар С. АСТРАЎЦОЎ.
Індэкс 63124.
Выходзіць штодватыдні па пятніцах.
Фотанабор, афсэтны друк.
Гарадзенская вабласная ўзбуйненая друкарня, 230003, г. Горадня, вул. Паліграфістаў, 4
Тыраж 2000 асобнікаў. Замова № 4160
Нумар падпісаны да друку 8.10.1992 г. у 17.00